

ЛІЧБАВЫ ДЭТАКС

6

ПРЫВІТАННЕ АД ЛЕДАВІКОЎ



19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 КАСТРЫЧНІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 194 (29563)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


## КОРАТКА

- **Сёння ў Жодзіне праходзіць 10-я сустрэча гарадоў-пабрацімаў Беларусі і Расіі. Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам.**
- Ва Узброеных Сілах Беларусі ладзіцца конкурс на найлепшага камандзіра інжынернага батальёна і роты.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ЧАБАТАР, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«За сем месяцаў па таварах і паслугах прырасці амаль на трэць. Дадатнае сальда перавысіла $2 млрд. З 2012 года гэта найлепшы вынік у знешнім гандлі, калі параўноўваць з аналагічнымі перыядамі мінулых гадоў. Асабліва трэба адзначыць захаванне па выніках студзеня—жніўня трэнду на павелічэнне паставак айчыннай прадукцыі за мяжу па ўсіх групах тавараў: энергетычных — у 2,1 раза, інвестыцыйных — на 34,7 %, спажывецкіх — на 17 %. Гэтыя поспехі прадвызначылі некалькі фактараў. Па-першае, рэпутацыя брэнда «беларускае», ведомага дзякуючы аптымальным суадносінам цаны і якасці. Па-другое, эфектыўная работа менеджменту прадпрыемстваў, якія своечасова скарэкціравалі вытворчыя планы, маркетынгавыя стратэгіі, лагістычныя ланцужкі. Па-трэцяе, у поўнай меры апраўдваюць сябе і інвестыцыі ў мадэрнізацыю дзеючых вытворчасцяў — флагманаў нашай індустрыі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Гэта момант адкрыць новыя магчымасці, мабілізавацца і дасягнуць выніку, нягледзячы ні на які ціск»

### Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб супрацьдзеянні санкцыйным мерам

**Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што раней было вырашана з перыядычнасцю раз у квартал, а калі трэба, то і часцей, сустракацца з урадам для абмеркавання пытанняў работы эканомікі.**

«***Нам трэба зрабіць усё, каб простыя сем'і і працоўныя калектывы ні ў якім разе не пацярпелі з-за нашых збеглых здраднікаў і іх заходніх спонсараў-куратараў***. Тых, хто бегае па Еўропе і Амерыцы і вымольвае санкцыі супраць Беларусі», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Сёння ўжо ніхто не сумняваецца, што асноўнай мэтай гэтага ашалелага шантажу з'яўляецца не барацьба за нейкія міфічныя правы чалавека», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што сацыялагічныя даследаванні пацвярджаюць перамогу дзеючага Прэзідэнта: «Я ўважліва адсочваю СМІ. І ў Расіі, і ў Амерыцы, і ў Еўропе, і ў Беларусі. У Беларусі заходнікі правялі сацыялагічныя даследаванні, у выніку якіх беларусы адназначна заявілі, што ніякая Ціханоўская выбары не выйгравала ніколі. І прызнаюць, што дзеючы Прэзідэнт адназначна перамог».



Фота БелТА.

Паводле яго слоў, мэта санкцый — ліквідаваць прамых канкурэнтаў, спустошыць і разбурыць ключавыя прадпрыемствы, дадушыць у выніку эканоміку Беларусі. «І, калі казаць адкрытым тэкстам, праз ліквідацыю заводаў і масавае беспрацоўе загнаць людзей у галечу, а ў лепшым выпадку — вывесці іх на вуліцы. Мы гэтага дапусціць не можам і не дапусцім», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што супраць Беларусі ідзе гібрыдная вайна і санкцыі — гэта яе эканамічны складнік. «***Нам трэба не толькі аператыўна і зладжана рэагаваць на ўсе выклікі, але і актыўна прымаць прэвентыўныя меры. Шукаць шляхі выхаду са становішча, якое склалася***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Эканоміка ў нас адкрытая, больш чым на 60 % завязаная на экспарт і знешнія рынкі».

СТАР. 2

Спажывец



# СЯБРОЎКА-ВОСЕНЬ

### Што пачым на сезонных кірмашах і мястэчковых рынках

**Прыкметы гарадской восені — сельскагаспадарчыя кірмашы. У выхадныя дні з пачатку верасня і аж да халодных лістападаўскіх дажджоў гарадскія жыхары запасаюцца вітамінамі на доўгую зіму. Калі вы адклалі паход па гародніну «на пазней», мы гатовыя распавесці аб асартыменце і цэнах.**

СТАР. 4

Нашы таленты

# ЯК АЎТАРСКІ МІНІ-ТРАКТАР ДА ГОРАК ДАВЯЗЕ

### Юны «кулібін» з аграгарадка Мічурынская Гомельскага раёна самастойна сканструяваў цэлую лінейку шматфункцыянальных сельгасмашын

**Сямнаццацігадовы Арцём ГУЛЕВІЧ ужо цяпер мае ўсе шанцы вырасці ў выдатнага інжынера-канструктара, а пакуль матывуе падлеткаў адарваца ад камп'ютарных гульняў ды «лега», зараджае любоўю да тэхнічнай творчасці, якая не прызнае бар'ераў.**



СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

21194

# «Гэта момант адкрыць новыя магчымасці, мабілізавацца і дасягнуць выніку, нягледзячы ні на які ціск»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт згадаў, што перад нарадай сустракаўся са спецыяльным пасланнікам Прэзідэнта Венесуэлы Аданам Чавесам: «Мы аднадушна заявілі пра тое, што нам трэба аднаўляць той узровень адносін, які ў нас быў, і значна пераўзыходзіць яго. У Венесуэле ёсць усё тое, што нам трэба. У нас ёсць усё тое, што трэба Венесуэле. Што нас стрымлівае? Трэба знайсці шляхі ўзаемаразлікаў, залікаў і гэтак далей і аднаўляць гандаль». «Трэба падрыхтаваць усё неабходнае для таго, каб прэзідэнты маглі ў найбліжэйшы час сустрэцца і абазначыць напрамкі нашага супрацоўніцтва», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца заходніх санкцый, Прэзідэнт падкрэсліў, што не схільны драматызаваць сітуацыю. «Як мне прэм'ер-міністр дакладвае, і ва ўрадзе няма ніякай драмы. Настрой на супрацьдзеянне санкцыям мне падабаецца. Так мы і павінны працаваць. Калі ёсць нейкія праблемныя пытанні, дык давайце будзем іх вырашаць. ***Мы ўжо прывыклі да рознага роду санкцый, не першы раз з імі сутыкаемся. Чарговыя спробы абмежаваць і запалохаць нас абарочваюцца супраць бізнесу і эканомікі той краіны, якая ўводзіць санкцыі***», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта ўжо адчулі на сабе і Прыбалтыйскія краіны, і Польшча, і Украіна. Мы па многіх каналах падтрымліваем кантакты з прадстаўнікамі гэтых дзяржаў, і яны ў адзін голас пра гэта кажуць. Ды і не толькі яны».

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь геаграфічна знаходзіцца не дзесьці ў закутку планеты або нейкага рэгіёна, а на самым перакрыжаванні. «І зачыніць краіну, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, немагчыма. Гэта вар'яцтва», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Беларусь заўсёды была надзейным партнёрам на знешніх рынках. «Мы асабліва ўважліва глядзім на Афрыканскі і Азіяцкі рэгіёны, дзе жыве 5,5 млрд чалавек — 70 % насельніцтва (свету. — **«Зв.»**)», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што цяперашняя сітуацыя для Беларусі — гэта выклік, пэўны выхад з зоны камфорту. «Але ў той жа час гэта момант адкрыць новыя магчымасці, мабілізавацца і дасягнуць выніку, нягледзячы ні на які ціск», — сказаў ён.

«Прыкладам таму з'яўляецца братняя Расія. Ну закрылі, як яны падумалі (на Захадзе. — **«Зв.»**). І Расія, адкінуўшы ўсялякія нюансы, павярнулася ўнутр, пагледзела на ўнутраныя свае рэзервы і зрабіла гіганцкі крок наперад. Асабліва па тых напрамках, якія з сярэдзіны 90-х гадоў былі страчаныя», — сказаў Прэзідэнт.

«Слухайце, але разам мы можам больш. Я толькі што з Прэзідэнтам Расіі размаўляў (тэлефонная размова лідараў дзвюх краін адбылася раніцай 7 кастрычніка. — **«Зв.»**). Ніякіх пытанняў. Мы можам, павінны, і Расія гатовая да таго, што мы разам будзем супрацоўнічаць па ўсіх тых напрамках, па якіх трэба для Беларусі. Слова за намі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Датычна эканомікі Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што рэзультаты работы па выніках васьмі месяцаў адчувальна вышэйшыя за прагнозныя лічбы і па аб'ёмах вытворчасці, і па экспарце, і па прыбытках насельніцтва. «Я ўжо казаў: ***ключавая задача — захаваць такую дынаміку да канца года. І гэта будзе велізарны поспех, калі не подзвіг***», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці знаходзяцца ў падобным напружанні кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, як разгарнулася МЗС, ці ёсць вынік ад пасольстваў і гандлёвых прадстаўнікоў.

Асобна ён запатрабаваў далажыць аб сітуацыі ў калійнай, нафтавай і авіяцыйнай галінах. У прыватнасці, на якой стадыі дамоўленасці з Расійскай Федэрацыяй па марскіх портах і па адкрыцці новых маршрутаў, не забываючы і пра старыя.

«Улічваючы, што ва ўрадзе створаны спецыяльныя групы, прашу інфармаваць вельмі канкрэтна і па сутнасці. ***Калі неабходна вырашаць пытанні (а зараз іх трэба вырашаць хутка), не павінна быць ніякай валакіты. Усе пытанні павінны вырашацца ў максімальна кароткія тэрміны***», — папярэдзіў Прэзідэнт.

## Каментарый у тэму

Гаворачы з журналістамі пра перспектывы супрацоўніцтва з іншымі краінамі ў сферы транзіту калійных угнаенняў і нафтапрадуктаў у наступным годзе, **першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ** пасля нарады ў кіраўніка дзяржавы падкрэсліў, што дастаўка гэтых тавараў да заказчыка будзе ажыццяўляцца зыходзячы ў першую чаргу з эканамічнай мэтазгоднасці. «Ніхто не кажа, што гэта спыніцца. Я сказаў бы, што гэта такія псіхалагічныя заявы ў інтэрнэце. Бізнес расставіць усё на свае месцы. Патрэба сусветнага рынку ў гэтых прадуктах расставіць усё на свае месцы», — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

Ён заўважыў, што на долю беларускага калію прыпадае больш за 20 % сусветнага экспарту. Пакідаць рынак без беларускай прадукцыі, а значыць, абвальваць яго немэтазгодна як з пункту гледжання сусветнай харчовай бяспекі, так і з пункту гледжання бізнесу як такога, звярнуў увагу Мікалай Снапкоў. Паводле яго слоў, сярэдні кошт доўгатэрміновых кантрактаў — крыху больш за 200 долараў за тону калію. Пры заключэнні спотавых здзелак кошт калію за тону сёння дасягае 1 тысячы долараў.

«Скажыце, фермерам, сельгасвытворцам свету патрэбна такая цана? Калі будзе такая цана асноўных інгрэдыентаў ураджаю, то якая будзе цана збожжа, соі? Думаю, што ў канчатковым выніку цвярозы розум пераможа і калій будзе прадавацца на рынку і далей», — падсумаваў Мікалай Снапкоў.

**Паводле БелТА.**

# «Надышоў час рэвізаваць адносіны Беларусі і Венесуэлы»

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас сустрэчы са спецыяльным пасланнікам Прэзідэнта Венесуэлы Аданам Чавесам Фрыясам, паведаміла БелТА.**

«У Беларусі не проста вельмі добра ведаюць, памятаюць нашага сябра — твайго брата (Адан Чавес — старэйшы брат былога Прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса. — **Заўв. БелТА**). Добра, што ты прыехаў у гэты час, ёсць аб чым пагаварыць, ёсць агульныя пытанні, якія мы павінны абмеркаваць. І адразу ж хачу сказаць, што справа не ў тых санкцыях, якія ўведзены супраць Венесуэлы і Беларусі. Абсалютна не. У нас ёсць вельмі сур'ёзная, магутная база і фундамент нашага супрацоўніцтва, закладзеныя яшчэ ў часы Чавеса, Мадуры (цяперашні Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура. — **Заўв. БелТА**). Трэба шчыра сказаць, што і Венесуэла, і Беларусь слаба карыстаюцца тымі перавагамі, якія былі створаны шмат гадоў таму», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, краінам ёсць на што абаперціся, каб у сучасных умовах процідзейнічаць любым атакам. «Мы поўныя рашучасці дзейнічаць у гэтым напрамку. Думаю, надышоў час рэвізаваць нашы адносіны і выбудаваць яшчэ больш моцныя адносіны. Гэта дзіўна, што мы маем у гандлёва-эканамічнай сферы адносіны такога ўзроўню. Пры гэтым усё, што ёсць у Венесуэле, патрэбна Беларусі. Тое, што ёсць у Беларусі, патрэбна ў Венесуэле, — адзначыў Прэзідэнт. — Нам трэба выбудаваць план аднаўлення нашых інтэнсіўных адносін і рэалізаваць яго ў найбліжэйшыя два-тры гады».

Адан Чавес, у сваю чаргу, заявіў, што для яго заўсёды вялікі гонар сустрэцца з Прэзідэнтам Беларусі і падзякаваць за падтрымку венесуэльскай дзяржавы. «Будзьце ўпэўненыя, што венесуэльскі народ у адносінах да беларускага народа адчувае такія ж эмоцыі. Спадар Мадура перадае вам вялікае прывітанне. Нашы адносіны да беларускага народа не змяніліся, паколькі ў сваёй большасці венесуэльскі народ — гэта «чавіскі народ». Ён з такой жа любоўю адносіцца да вас», — сказаў спецпасланнік.

Адан Чавес Фрыяс у гэтыя дні наведвае Беларусь. Спецпасланнік Прэзідэнта Венесуэлы сустрэўся са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай і Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам.

Раней Адан Чавес Фрыяс ужо наведваў Беларусь. У кастрычніку 2017 года ён увайшоў у склад урадавай дэлегацыі ў рамках візіту Прэзідэнта Венесуэлы Нікаласа Мадуры.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Рэйтынг Байдэна знізіўся да рэкорднага ўзроўню

**Рэйтынг адабрэння амерыканцамі дзейнасці прэзідэнта ЗША Джо Байдэна знізіўся да найбольш нізкага ўзроўню за час яго знаходжання на дадзенай пасадзе. Пра гэта сведчаць апублікаваныя даныя апытання, праведзенага Квініпэкскім універсітэтам у ЗША, паведамляе ТАСС.**

Як сведчаць вынікі даследавання, адмоўна работу Джо Байдэна ацэньваюць 53 % амерыканцаў, а станоўча — толькі 38 %. Падчас папярэдняга апытання, праведзенага тым жа ўніверсітэтам тры тыдні таму, станоўча Джо Байдэна ацэньвалі 42 %, адмоўна — 50 %. Такім чынам, прасочваецца тэндэнцыя да зніжэння папулярнасці амерыканскага прэзідэнта.

Пры ацэнцы дзейнасці Джо Байдэна вельмі моцная залежнасць ад палітычных поглядаў. Сярод рэспубліканцаў адмоўную ацэнку яго дзейнасці далі 94 % апытаных, а сярод дэмакратаў — усяго 10 %.

Асаблівую незадаволенасць у амерыканцаў выклікае палітыка прэзідэнта адносна імігрантаў і сітуацыя на паўднёвай граніцы ЗША, праз якую спрабуюць прабрацца тысячы жыхароў Лацінскай Амерыкі. Толькі 28 % апытаных выказаліся ў падтрымку курсу Байдэна па Афганістане. 50 % лічаць, што ЗША павінны былі пакінуць у краіне пэўныя сілы для яе падтрымкі, 15 % мяркуюць, што ваенных наогул выводзіць не трэба было. Станам эканомікі ў той ці іншай ступені незадаволеныя 72 % амерыканцаў.

## Сінгапурскі прафесар прадказаў з'яўленне новага каранавіруса SARS-CoV-3

**Прафесар Ван Ліньфа з амерыканска-сінгапурскага медыцынскага ўніверсітэта Duke-NU прадказаў свету з'яўленне новага каранавіруса SARS-CoV-3. Яго словы перадае партал Straits Times.**

Ліньфа папярэдзіў, што каранавірус SARS-CoV-2 можа муціраваць і вярнуцца ад чалавека да жывёлін, пасля чаго зноў перайсці на чалавека як найноўшая мутацыя SARS-CoV-3 і выклікаць новую пандэмію. У якасці мер прафілактыкі з'яўлення новых мутацый Ліньфа прапанаваў адсочванне новых захворванняў у кажаноў і іншых дзікіх жывёлін, патэнцыял іх пераходу да чалавека і распрацоўку больш надзейнай сістэмы пастаяннага назірання за ўспышкамі.

Вірусолаг НДЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя Гамалеі Міністэрства аховы здароўя Расіі, прафесар Аляксандр Бутэнка таксама лічыць, што супрацьстаяць небяспечным патагенам могуць толькі ўдасканаленыя вакцыны.

«Распрацоўшчыкі вакцын ужо цяпер пачынаюць рабіць новыя камбінаваныя прэпараты. У іх будуць утрымлівацца антыгены некалькіх дамінуючых генатыпаў віруса», — сказаў вучоны.

## МЗС Расіі папярэдзіў аб пагрозе ператварэння космасу ў арэну канфліктаў

**Кіраўнік дэпартамента па пытаннях нераспаўсюджвання і кантролю над узбраеннямі МЗС Расіі Уладзімір Ермакоў у сваім дакладзе для пасяджэння Першага камітэта Генасамблеі ААН па пытаннях кантролю над узбраеннямі папярэдзіў аб пагрозе ператварэння космасу ў арэну канфліктаў, паведамляе ТАСС.**



«Рызыкі ператварэння космасу ў арэну канфліктаў набываюць цалкам рэальныя абрысы», — сказаў Ермакоў. Дыпламат звярнуў увагу на тое, што шэраг краін — членаў ААН «рэалізуе курс на размяшчэнне зброі ў космасе, нарошчванне патэнцыялу сілавога ўздзеяння на касмічныя аб'екты і выкарыстанне касмічнай прасторы для вядзення баявых дзеянняў у мэтах дасягнення ўласнай ваеннай перавагі».

Раней кіраўнік МЗС Расіі Сяргей Лаўроў заявіў, што Расія выступае за пачатак перагавораў па забароне размяшчэння ўзбраенняў у космасе. Ён падкрэсліў, што магчымасць выкарыстання космасу на карысць чалавецтва можа забяспечыць толькі гарантаванае прадухіленне там гонкі ўзбраенняў.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ, ЯК ЗАЎСЁДЫ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 9 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Бяспека

# «ПЕРАЙСЦІ НАШУ ГРАНІЦУ МОЖНА ТОЛЬКІ АФІЦЫЙНА»

**Аб гэтым заявіў міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ, які ўчора сустракаўся з актывам Брэстчыны, а таксама наведаў адзін з пунктаў пропуску на беларуска-польскай граніцы і пагранічную заставу.**


Фота БелТА.

— У нас дастаткова сіл і сродкаў, каб забяспечыць парадак на тэрыторыі нашай краіны, — адзначыў кіраўнік сілавога ведамства. — Што датычыцца граніцы, асабліва з Еўрасаюзам, сапраўды спрабуюць прымусіць грамадзян перайсці граніцу на тэрыторыю Беларусі, у тым ліку з прымяненнем сілы. Аднак і нашы пагранічнікі, і супрацоўнікі ўнутраных войскаў МУС нясуць сумесна службу ва ўзмоцненым рэжыме. Перайсці нашу граніцу можна толькі афіцыйна.

Як заўважыў генерал-лейтэнант міліцыі, усе мігранты, якія звярнуліся па дапамогу ў дзяржаўныя органы Беларусі, яе атрымалі. «За гэты год у МУС з хадайніцтвам аб абароне звярнулася кая 360 чалавек, 90 з якіх — непаўналетнія, — падкрэсліў міністр унутраных спраў. — Усім гэтым людзям была аказана дапамога. Ні адзін з грамадзян не застаўся без увагі з боку дзяржавы. У тым ліку амаль 60 іншаземцам, у якіх не было магчымасці дзесьці пражываць, не было сродкаў для існавання, аказана дапамога. На тэрыторыі Гомельскай і Віцебскай абласцей створаны спецыяльныя цэнтры для бежанцаў, дзе ім аказваецца ўсялякая дапамога — як матэрыяльная, так і псіхалагічная».

Адрэагаваў Іван Кубракоў і на негатыўныя каментарыі ў сацыяльных сетках, звязаныя з трагічнай гібеллю супрацоўніка КДБ. «На гэтай смерці нехта спрабуе злавіць хайп, — заўважыў міністр унутраных спраў. — На сёння ўжо затрымана каля 200 грамадзян, якія пісалі ў тэлеграм-каналах розныя брыдоты, спадзеючыся на тое, што ніхто іх не знойдзе, хаваючыся пад так званымі нікамі, заклікалі браць зброю і выходзіць на вуліцу. Усе яны знаходзяцца ў турме, узбуджаны крымінальныя справы, ідзе следства, устанаўліваюцца ўсё новыя асобы».

Па словах кіраўніка МУС, паводзіны такіх «змагароў» пасля арышту рэзка мяняюцца. «У інтэрнэце пішуць адно: заклікаюць ісці забіваць, прычым не толькі супрацоўнікаў сілавога блока, а і іншых грамадзян, у якіх іншае меркаванне, — удакладніў Іван Кубракоў. — Як толькі затрымліваюць і прыцягваюць да адказнасці, плачуць, успамінаюць пра свае сем'і, родных і блізкіх. Я ўсіх заклікаю задумацца ў гэты Год адзінства, аб'яднацца і жыць мірна і спакойна ў нашай краіне».

**Паводле БелТА.**

Надвор'е

# Вось і прыйшоў ноччу ўпэўнены мінус

## А ў панядзелак чакаюцца дажджы

**Завяршаецца першая дэкада кастрычніка. І, на дзіва, досыць холадна. Асабліва ўначы.**

Да канца гэтага тыдня ўмовы надвор'я ў нашай краіне будзе па-ранейшаму вызначаць заходняя перыферыя шырокага антыцыклону з цэнтрам над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі, а гэта значыць, што захаваецца сухое надвор'е. Разам з тым пры малавоблачным небе і слабым ветры на большай частцы тэрыторыі нашай краіны чакаюцца замаразкі да мінус 5 градусаў. Таму не варта пакідаць на палях выкапаную сельскагаспадарчую прадукцыю, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



Сёння ўдзень будзе суха і амаль без ветру. Максімальная тэмпература паветра ад плюс 9 градусаў да 14 цяпла.

У суботу і нядзелю таксама без ападкаў. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы з узмацненнем да ўмеранага. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца замаразкі да мінус 5 градусаў, месцамі — 1—4 градусы вышэй за нуль. Удзень будзе ад 8 цяпла да плюс 14 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня антыцыклон будзе губляць свой уплыў у Беларусі. Ціск пачне падаць, павялічыцца колькасць аблокаў, а франтальныя раздзелы з Заходняй Еўропы прынясуць дажджы. І, магчыма, крыху пацяплее. Замаразкаў не будзе, праўда, часова.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Па палічках

# І паедуць жыхары буйных гарадоў у вёску?

## Што мяняецца ў дзяржпадтрымцы будаўніцтва жылля

**Першага кастрычніка Прэзідэнт падпісаў Указ № 375 «Аб мерах па аказанні дзяржаўнай падтрымкі». Пра што кажа гэты дакумент і калі ён уступае ў сілу? Гэтыя пытанні мы задалі прэс-службе будаўнічай галіны. Там пагадзіліся пракаментаваць дадзены ўказ.**

Па-першае, гэты дакумент накіраваны на слушнае ўдасканаленне дзяржаўнай жыллёвай палітыкі, а таксама ён рэгулюе пытанні, якія ўзнікалі ў працэсе практычнай рэалізацыі ўказаў кіраўніка дзяржавы (у галіне будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў з дзяржаўнай падтрымкай).

Напрыклад, у дакуменце прадугледжваецца атрыманне права на пазачарговую дзяржаўную падтрымку грамадзянам, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу па месцы жыхарства ў абласных цэнтрах і Мінску, калі такія людзі ажыццяўляюць будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылля ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек.

Дарэчы, у цяперашні час чаргавікі абласных цэнтраў і Мінска маюць права атрымаць дзяржаўную падтрымку пры будаўніцтве жылля ў населеных пунктах з колькасцю да 20 тысяч чалавек, але з улікам агульнай чаргі.

Цяпер жа, каб атрымаць права на пазачарговую льготу, у дадзеным дакуменце замацаваны заяўны прынцып накіравання чаргавікоў абласных цэнтраў і Мінска на долевае будаўніцтва жылля ў населеных пунктах з колькасцю да 20 тысяч чалавек з атрыманнем дзяржаўнай падтрымкі.

Другім пунктам Указа № 375 абмяжоўваюцца выпадкі атрымання дзяржаўнай падтрымкі грамадзянам, якія паляпшаюць жыллёвыя ўмовы не па месцы пастаноўкі на жыллёвы ўлік. У прыватнасці, гэта робіцца ў мэтах прыняцця мер да прадухілення адтоку жыхароў з сельскіх населеных пунктаў і пасёлкаў гарадскога тыпу.

Тут дазволю сабе канкрэтызаваць гэтую норму цытатай з дакумента. «Дзяржпадтрымка будзе аказвацца грамадзянам, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу:

у абласных цэнтрах і горадзе Мінску — пры будаўніцтве жылля ў гарадах (за выключэннем абласных цэнтраў і сталіцы), пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх населеных пунктах (за выключэннем населеных пунктаў Мінскага раёна);

у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання — пры будаўніцтве жылля ў пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх населеных пунктах (за выключэннем населеных пунктаў Мінскага раёна);

у пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх населеных пунктах — у сельскіх населеных пунктах (за выключэннем населеных пунктаў Мінскага раёна).



Трэці пункт гэтага дакумента прадугледжвае дадатковую ахову інтарэсаў шматдзетных сем'яў. Для іх прадугледжваецца павелічэнне да 23 гадоў узросту дзяцей, пры якім даецца права на атрыманне фінансавай дапамогі ў пагашэнні льготных крэдытаў або субсідый на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдытах, атрыманых у рамках Указа ад 4 чэрвеня 2017 года № 240.

**Для даведкі.** У цяперашні час права на атрыманне фінансавай дапамогі і субсідыі на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдытах дадзена шматдзетным сем'ям, якія маюць трох і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Пры гэтым права на атрыманне льготнага крэдыту альбо субсідыі на выплату часткі працэнтаў па крэдытах дадзена шматдзетным сем'ям, якія маюць трох і больш дзяцей ва ўзросце да 23 гадоў (якія не ўступілі ў шлюб і пражываюць з бацькамі).

Наступны пункт указа абараняе інтарэсы членаў сем'яў атрымальнікаў дзяржаўнай падтрымкі. Ён датычыцца паўналетніх сваякоў главы сям'і, які памёр у перыяд будаўніцтва жылля і не атрымаў у поўным аб'ёме крэдыт, у тым ліку льготны. Цяпер такім членам сям'і даецца магчымасць дакрэдытавацца і атрымаць субсідыі ў поўным аб'ёме.

Канкрэтна ва Указе № 375 вызначаецца механізм вылучэння дзяржаўнай падтрымкі паўналетняму члену сям'і памерлага крэдытаатрымальніка (атрымальніка субсідый), а таксама ўрэгулявана пытанне заключэння з ім дагавора долевага будаўніцтва.

Гэтым жа пунктам даецца магчымасць пераводу доўгу па льготных крэдытах на былых мужа і жонку з захаваннем за імі права на атрыманне фінансавай дапамогі пры наяўнасці (нараджэнні) дзяцей і адтэрміноўкі ў пагашэнні льготнага крэдыту.

У пятым пункце гэтага дакумента прадугледжваецца дадатковая падтрымка асобных катэгорый грамадзян. Напрыклад, павялічваецца да 30 квадратных метраў (цяпер 20 «квадратаў») нарматыў крэдытавання кватэр у блакіраваных жылых дамах для грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у вёсцы (у выпадку будаўніцтва імі на вёсцы кватэр агульнай плошчы больш за 100 квадратных метраў). Павялічваецца з 3 да 6 месяцаў тэрмін вяртання грамадзянамі ў бюджэт пералічаных ім сум субсідый на пагашэнне крэдыту (у выпадку адмовы ад будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай).

Акрамя таго, рэгулюецца пытанне павелічэння ў перыяд будаўніцтва жылля максімальнага нарматыўнага кошту жылля на 15 квадратных метраў сем'ям, у якіх дзіця прызнана інвалідам пасля прыняцця рашэння аб вылучэнні дзяржпадтрымкі і які мае права на дадатковую плошчу.

Указ № 375 уступае ў сілу (за выключэннем некалькіх нормаў) з 15.01.2022 года, паколькі для яго рэалізацыі неабходна прывесці ў адпаведнасць з указам восем пастаноў урада.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СЯБРОЎКА-ВОСЕНЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



У мінулыя выхадныя сельскагаспадарчыя кірмашы прайшлі ва ўсіх раёнах сталіцы, а мы праехаліся па пляцоўках, дзе разгарнуўся самы ажыўлены гандаль. Свой ураджай у Мінск прывезлі і фермеры, і сельгаспрадпрыемствы. Прадстаўлена практычна ўся Беларусь, хоць большая частка гародніны-садавіны нашай сярэдняй паласы, зразумела, «родам» з Мінскай вобласці. Здалёк на сезонны кірмашы ў асноўным вязуць «эксклюзіў» — белавежскія зёлкі, сушаныя ягады, лясны мёд...

Наогул, восеньскія сельскагаспадарчыя кірмашы пазіцыянуюцца як спосаб, з аднаго боку, сабраць на адной пляцоўцы ўсё восеньскае багацце, і з другога — закупіцца як мага танней. І калі па першым пункце ўсё атрымалася, то, што датычыцца цэн, яны па факце ніжэйшыя за тыя ж «камароўскія» толькі па шэрагу пазіцый, а ў цэлым супастаўныя.

## Прысмакі і прыправы

Гэтую восень цяжка назваць шчодрай (год на год не прыходзіцца, кажуць прадаўцы), але сезонныя кірмашы атрымаліся багатымі. Напрыклад, можна купіць сапраўдны лясны мёд. Прастуды не дрэмлюць, ковід атакуе, так што попыт на гэты прадукт вялікі.

— Лясны мёд — сапраўдны прыродны антыбіётык, — нахвальвае свой тавар прадавец, мужчына сярэдніх гадоў. — Цяпер мёд патрэбны ў кожным доме: і імунітэт умацуе, і арганізм падтрымае.

Салодкі тавар, якім гандлявалі ў гэтыя выхадныя на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны», прыехаў у Мінск з Браслаўскіх азёр.

У старажытнасці лясны мёд атрымлівалі шляхам фарміравання вулляў на дрэвах, расказвае прадавец. Цяпер проста ставяць вуллі паблізу лесу, і пчолкі збіраюць нектар з кветак, што растуць у натуральным, экалагічна чыстым асяроддзі.

Як адрозніць менавіта лясны мёд? Вельмі проста, растлумачылі мне.

— Колер ляснога мёду можа быць розны: і светлы, бурштынавы, і цёмна-карычневы. Але ён заўсёды будзе цямнейшы за лугавы або ліпавы. Яшчэ можна адрозніць лясны мёд па водары — ён больш насычаны. І па смаку: лясны мёд заўсёды больш даўкі. А вось гэты — пакаштуйце! — сабраны ў хваёвым лесе. Адчуваеце лёгкую кіслінку? Гэта адметная рыса.

Лясныя травы, з якіх браслаўскія пчолкі збіралі мёд, — дзікая маліна (што асабліва актуальна падчас грыпу), крушына, рабіна, ліпа, скрыпень, сумнік...

Зразумела, што кожны цыган сваю кабылу хваліць, але дыетолагі таксама кажуць аб неверагоднай карысці ляснога мёду. Там прысутнічае і глюкоза (для эфектыўнай работы галаўнога мозгу і канцэнтрацыі ўвагі), і аскарбінавая кіслата (змагаецца з вірусамі), і поўны спектр вітамінаў групы В (для паўнавартаснай работы ЦНС і рэпрадуктыўнай сістэмы), і дэфіцытны ў нашых шыротах ёд, і магній для сэрца і цягліц, і каразін для вастрыні зроку, і жалеза для падтрымання ўзроўню гемаглабіну ў крыві. Мёд (асабліва лясны) — гэта і супрацьзапаленчае, і супрацьмікробнае, і антыаксідант, і сродак супраць болю, і наогул літаральна эліксір жыцця.

## А выбіраць яго трэба так...

— Прасцей за ўсё — па даўжыні бруі. Чым даўжэй цягнецца «нітачка», тым лепшы і свяжэйшы мёд.

Нядаўна адкачаны мёд, аказваецца, у лужынку не расцякаецца, а кладзецца «горачкай». Гэта прыкмета натуральнасці прадукту. А яшчэ свежавыкачаны мёд заўсёды крыху вадкі. Любы, акрамя верасовага, — гэты мае шчыльную кансістэнцыю і нагадвае ў слоіку жэле.

Па цане лясны мёд на сельгаскірмашах супастаўны з лугавым. 7-8 рублёў паўлітра, ад 14 да 15 — літр.

Яшчэ адна цікавая таварная пазіцыя, якую можна адшукаць на сталічных сезонных кірмашах цяпершняй восенню, — прыправы з Белавежскай пушчы. Без кансервантаў, узмацняльнікаў смаку і нават без солі. Дарэчы, менавіта такія прыправы — проста сушаныя духмяныя траўкі — ухваляюць прафесійныя кухары, менавіта іх называюць сапраўднымі. Іншыя — з соллю і глутаматам натрыю — забава для прафанаў у кулінарыі і наогул сурагатная замена. Беларусь наўрад ці можна назваць радзімай спецый, але ў нас, як сцвярджаюць вытворцы, ёсць старадаўняя самабытная культура вырабу і прымянення прыпраў. І цяпер самы час яе адрадзіць. У асартыменце — 25 відаў прыпраў у рознай фасоўцы (да курыцы, мяса, сала, рыбы і гэтак далей), травяныя чаі ручной работы і сушаныя ягады па старадаўняй тэхналогіі. У сярэднім 100 грам смачнай духмянай сумесі зёлак абыдзецца ў 5—8 рублёў. Дарагавата, але гэта таго варта, кажуць тыя, хто пакаштаваў.

## Мясцовыя рынкі як модны трэнд

У прынцыпе восенню любы рынак невялікага гарадка ператвараецца ў сезонны кірмаш. Імпартных гародніны-садавіны практычна няма, усё натуральнае, вырашчанае за гадзіну язды. Гэта значыць, самае карыснае, калі верыць спецыялістам па правільным харчаванні. Згодна з папулярнай сучаснай тэорыяй, найбольш правільныя для чалавека прадукты — тыя, што вырашчаны ў радыусе 100 міль (160 км) ад месца яго пражывання. У Заходняй Еўропе і Амерыцы гэта называецца «лакаварства» (ад англ. local — мясцовы) і паступова становіцца мэйнстрымам. Трэнд актыўна падтрымліваюць дарагія рэстараны. На беларускіх мясцовых рынках гэтая норма вытрымліваецца з лішкам: вы набываеце прадукты (не ўсе, але вельмі многія), вырашчаныя значна бліжэй за 160-кіламетровую акружнасць, тыя, што «нарадзіліся» і наліліся пажыўнымі сокамі літаральна побач.



Бульба ў Заслаўі нятанная...

Дарэчы, ездзіць на невялікія мясцовыя рынкі апошнім часам палюбілі жыхары вялікіх гарадоў. Гэта і сапраўды цікава. Такія рынкі — так бы мовіць, душэўныя: і пагаварыць ёсць з кім, і прадукты часта больш якасныя, чым у горадзе, і каларыт, і якое-ніякое, а ўсё ж падарожжа.

Проста на ўваходзе на Заслаўскі рынак утульнага выгляду гаспадыня прапануе пакаштаваць маліны. Паўлітровая шкляначка — 3 рублі. Маліны буйныя, у шклянку шмат ягад не змесціцца. Але сапраўды вельмі салодкія і духмяныя.

— А гэта шыпшына?

— Глог. Першы сродак для сэрца і нармалізуе сон. У мяне ёсць пастаянныя кліенты-сардэчнікі, прыязджаюць па мой глог.

Журавіны тут можна купіць па 6-7 рублёў, у Мінску на сезонных кірмашах самая хадавая цана — 8 рублёў за кілаграм.

— Вазьміце яблыкі, паўтара рубля, — прапануе яе суседка. І шчыра прызнаецца: кіслыя. На шарлотку выдатна падыдуць, а каб паесці — у гэтым годзе не надта ўдаліся.

І, вядома, у вялікім асартыменце тут прадстаўлены мёд — як на любым рынку ў верасні-кастрычніку.

— Гэта першацвет, а гэта жнівеньскі, — распавядае аб сваім тавары Святлана. — Мы ў Ермаках жывём, там толькі лес і балота, ніякіх дарог паблізу. Так што прадукт самы чысты.

Мёд Святлана прадае па 10 рублёў за паўлітровы слоічак і 13 рублёў за літр. Гэта значыць, паўлітрамі купляць мёд больш выгадна ў Мінску на сезонных кірмашах, а літрамі — тут, у Заслаўі.

— Дорага? — здзіўляецца суразмоўца. — А вы паглядзіце, колькі каштуе кілаграм цукерак! Дык ад цукерак ніякай карысці, а мёд умацоўвае здароўе.



Памідоры можна знайсці нават па 80 капеек. Але па якасці яны — не ў свежую салату, а на аджыку або сок.

Яшчэ Святлана прадае мёд у сотах, пяргу і кветкавы пылок. Пылок у вялікім слоіку выглядае дзіўна — малюсенькія рознакаляровыя камяньчыкі.

**Восеньскія сельскагаспадарчыя кірмашы пазіцыянуюцца як спосаб, з аднаго боку, сабраць на адной пляцоўцы ўсё восеньскае багацце, і з другога — закупіцца як мага танней.**

— На смак ён саладкаваты з гарчынкай і змяшчае цэлых 50 карысных рэчываў, якія насычаюць арганізм сілай і здароўем і ўмацоўваюць імунітэт, — звыкла тлумачыць Святлана ўласцівасці пылку і дадае, што прадукт любяць тыя, хто не хоча хварэць у сезон прастуд.

Асноўная мэта большасці наведвальнікаў сезонных рынкаў — бульба, капуста, морква, цыбуля, буракі (іх, дарэчы, у гэтым годзе чамусьці прадаюць радзей, чым звычайна, — часам нават даводзіцца пашукаць). Што па цэнах?



**Мёд (асабліва лясны) — гэта і супрацьзапаленчае і супрацьмікробнае, і антыаксідант, і сродак супраць болю, і наогул літаральна эліксір жыцця.**

Бульба, без якой зімой не абысціся (фермерская, буйная, белая і ружовая), тут каштуе рубель трыццаць. На сезонных кірмашах будзе танней — ад 80 капеек да рубля дваццаці. Ды яшчэ і дадому можна папрасіць даставіць, калі бярэш шмат.

Капуста («Бярыце, апошні качан, усю ўжо разабралі!») у Заслаўі каштуе ад рубля дваццаці да рубля пяцідзесяці, на кірмашах у горадзе яе можна купіць за рубель — рубель дваццаць за кіло. Цыбуля — рубель сорак супраць рубля дваццаці ў Мінску. Тое ж самае з буракамі.

Салодкія і прыгожыя яблыкі можна тут купіць за 2-2,50, кіслыя — ад рубля за кілаграм. Пінскія агуркі — аж 4,30. Слуцкія — за тры (што зробіш, лета скончылася!). На сезонных кірмашах у Мінску і гэтая пазіцыя будзе таннейшай — у сярэднім тры рублі за кіло, калі агурочкі прыгожыя, але можна знайсці і за меншыя грошы.

— Наогул, рынак стаў вельмі дарагі, — дзеліцца пара пенсіянераў. — Раней мы бралі тую ж капусту па 65 капеек за кілаграм, а цяпер ужо рубель дваццаць. Калі бярэш шмат на зіму (мы квасім сабе і дзецям, і на свежую капусту, і на салаты), вельмі адчуваецца розніца.

І, зразумела, які ж кірмаш без сала? Але тут ужо, вядома, цэны сапраўды кусаюцца. І ў Заслаўі, і на кірмашах у Мінску за прыгожае сала просяць 15—17 рублёў. А вось «пальцам пханая» каўбаска ў Заслаўі таннейшая на цэлыя тры рублі: 20 супраць 23-х за кілаграм.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ЯК АЎТАРСКІ МІНІ-ТРАКТАР ДА ГОРАК ДАВЯЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Інтарэс да тэхнікі і будовы механізмаў праяўляюць многія хлопцы, але не ва ўсіх хапае ўседлівасці, каб дамагчыся значных вынікаў. Безумоўна, важна, каб своечасова побач апынуліся людзі, якія дапамогуць добрай парадай, разаўюць захапленне юнага канструктара. Арцёму Гулевічу пашанцавала. Цяпер ён на трэцім курсе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа, атрымлівае спецыяльнасць «тэхнік-механік». Кім хоча стаць, на каго будзе вучыцца — здаецца, ён гэта ведае, колькі сябе памятае. Кажа, з дзяцінства гуляў толькі з сапраўднымі жалезкамі. Захапляўся работай бацькі. Валерый Пятровіч амаль 20 гадоў працуе слесарам-наладчыкам на жывёлагадоўчым комплексе КСУП «Брылёва» Гомельскага раёна.

— У мяне змалку адно жаданне — майстраваць. Мяне і бацька гэтаму заўсёды вучыў, і настаўнік працоўнага навучання Брылёўскай сярэдняй школы Васіль Якоўчык. Чарчэнне, асновы механікі — без гэтага ў канструяванні не абысціся. Мне цікава, як функцыянуюць розныя механізмы. Прыдумваў, як можна палепшыць іх работу. Калі ў 6 класе ў мяне з'явіўся мапед, я пачаў яго ўдасканальваць. На ўсе кішэнныя грошы купляў неабходныя прылады і дэталі. Многае падбіраў з тэхнікі, якая ўжо адслужыла свой тэрмін, — дзеліцца Арцём Гулевіч.



Ужо на 1-м курсе каледжа юнак сабраў свой першы міні-трактар. Падчас яго зборкі адпрацаваў навыкі рэзкі па метале і зваркі. Апрабаваў агрэгат у рабоце на бацькоўскім прысядзібным участку. І адразу ж узяўся за новую зборку — больш увагі пачаў аддаваць функцыянальнасці машыны. Свой першы самастойна сабраны мінітрактар юнак прадаў. На яго, а потым і яшчэ на два новыя агрэгаты вытворчасці юнага канструктара, пакупнікі знайшліся вельмі хутка. Прыязджалі па яго тэхніку нават з іншых раёнаў Гомельшчыны.

Карысныя веды для зборкі механізмаў Арцём Гулевіч бярэ са спецыяльнай літаратуры і тэматычных ролікаў у інтэрнэце. Але сёння, прызнаецца, для яго на першым месцы — вучоба ў каледжы. Вучыцца, кажа, лёгка.

— Арцём — актыўны хлопец. Да таго ж ён мэтанакіравана пайшоў вучыцца на спецыяльнасць «Тэхнічнае забеспячэнне сельскагаспадарчай вытворчасці». Адразу відаць, што яму цікавыя спецдысцыпліны, — адзначае **куратар групы Арцёма ў каледжы Аксана ЧКАНА.**

Будучы тэхнік-механік не забывае пра сваю малую радзіму. У родным аграгарадку Мічурынская яго чакаюць як будучага маладога спецыяліста КСУП «Брылёва» — тут добра ведаюць усю яго працавітую сям'ю. Хлопец атрымаў мэтавае накіраванне на размеркаванне ў гаспадарку. Не забывае Арцём і родную школу.

— Мінулай вясной я спецыяльна прасіў Арцёма, каб ён пад'ехаў да школы на сваім трактары і расказаў вучням пра працэс яго стварэння. Вельмі таленавіты хлопец — ганаруся ім, — дзеліцца **настаўнік працоўнага навучання Брылёўскай сярэдняй школы Васіль ЯКОЎЧЫК.**

Але ўжо цяпер Арцём нацэлены працягнуць вучыцца далей. Пасля заканчэння каледжа ён вырашыў, што як толькі асвоіцца на першым рабочым месцы, будзе паступаць у Беларускую дзяржаўную акадэмію ў Горках.

— Вядома ж, пайду далей вучыцца на інжынера-механіка. Без варыянтаў! — кажа Арцём.

Увогуле ж у юнака з Гомельскага раёна вельмі шмат планаў. Марыць працягваць канструктарскую дзейнасць і развівацца ў тэхнічнай творчасці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота з архіва героя**
**і Буда-Кашалёўскага**
**аграрна-тэхнічнага каледжа.**

---

Традыцыі

# Гэта смачнае слова «Чэрыкаў»

## На паўднёвым усходзе актыўна развіваюць кулінарны турызм

**Невыпадкова менавіта ў гэтым райцэнтры нарадзілася прыгожае свята-кірмаш Дзень варэння. Сёлета яго адзначалі ўжо пяты раз. Гаспадыні выставілі на конкурс аж 100 (!) найменняў смачнага прадукту. Бананавае, з часночных стрэлак, пялёсткаў ружы... — якіх толькі інгрэдыентаў тут няма! Сёлета, напрыклад, каштавалі новы варыянт з экзатычнай мамардзікі. А яшчэ з бульбы, морквы і лімону, чорнай парэчкі з мёдам і бальзамам. У спалучэнні з блінамі, пірагамі, гарбатай гэта так смачна — не адарвацца. Магчыма, ужо час і пра зборнік рэцэптаў падумаць. Такая кніга стала б бестселерам не толькі для чэрыкаўскіх гаспадынь.**



### На ўласны манер

**Кацярына КАРКОЗАВА, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чэрыкаўскага райвыканкама**, успамінае, як усё пачыналася. Дэлегацыя з Чэрыкаўскага раёна ўдзельнічала ў адным з фестываляў у Віцебску. Прыехала шмат гасцей, у тым ліку і з Прыбалтыкі. Калега з Літвы падзяліўся брашуркай з апісаннем тамтэйшых мясцовых свят. І вока адразу ж зачапілася за Дзень варэння. Вырашана было паспрабаваць зрабіць нешта падобнае на чэрыкаўскі манер. Стартавала свята ў 2017-м.

— Гэта быў пробны варыянт, хацелі даведацца, ці будзе каму-небудзь цікава, — расказвае Суразмоўца. — Свята супадае з Яблычным Спасам, які шырока адзначаюць у Слаўгарадскім раёне на Блакітнай крыніцы. Народ у асноўным едзе туды. На першы раз усё было дастаткова сціпла, але цікавасць абудзілася. Вырашана было добрую справу развіваць. За год распрацавалі паўнавартасную праграму з шэсцем і іншымі інтэрактывамі. Ад той канцэпцыі стараемся і сёння не адыходзіць, але навацыі прысутнічаюць. Купілі касцюмы для Каралевы варэння і яе памочнікаў, каб было больш відовішчна. І нашым гасцям гэта падабаецца. Сёлета па колькасці прысутных наш фэст пабіў усе рэкорды. З іншага боку, інакш і быць не магло. Наша свята вельмі душэўнае і цёплае, яго ў нас любяць і дзеці, і дарослыя. З ім мы ўвайшлі ў кнігу «Фестывалі ад «А» да «Я».

### Рэцэпт блакаднага хлеба

Хутка ў раёне з'явіцца яшчэ адзін фестываль — хлебны. Сёлета на Дзень народнага адзінства ў школе № 2 Чэрыкава запрацаваў Цэнтр хлебапячэння. Ён быў створаны на базе музея хлеба (існуе з 1990 года) і аўдыторыі для заняткаў працоўным навучаннем. У аўдыторыі зараз размясцілася невялікая міні-пякарня.

— Музей патрабаваў абнаўлення, а грошай не было, — расказвае **дырэктар школы Мікалай ЛАПАСІН.** — І мы прынялі рашэнне паўдзельнічаць у праектах, якія дапамаглі б знайсці сродкі яго аднавіць і зрабіць больш сучасным. Так нарадзілася ідэя стварыць Цэнтр хлебапячэння. Калі раней мы дзецям толькі расказвалі пра хлеб, яго шлях ад зерня да стала, то зараз зможам наглядна ўсё пячы. Дзякуючы ўдзелу ў рэгіянальнай ініцыятыве, што праходзіла ў рамках праекта «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці», мы атрымалі грант, які дазволіў стварыць гэты цэнтр. Будзем адраджаць і захоўваць традыцыі хлебапячэння. У нас, дарэчы, ёсць рэцэпт нават блакаднага хлеба. У свой час нам яго перадала ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны Валянціна Жыбуль.

Грант школа атрымала ў мінулым верасні. На гэтыя грошы былі закуплены хлебапечка, кухонны камбайн, электрапліта, посуд і іншыя прыстасаванні, неабходныя для прыгатавання карыснага прадукту.

— Мы купілі ўсё неабходнае не толькі сабе, але і рэгіянальным партнёрам — краснапольскай і слаўгарадскай школам, каб яны таксама пяклі хлеб і дзяліліся з намі рэцэптамі, — удакладняе дырэктар. — Акрамя гэтага, закупілі абсталяванне для правядзення майстар-класаў: ноўтбукі, смарт-тэлевізар для вэбінараў, прынтар, музычнае абсталяванне для правядзення штогадовага фестывалю хлеба. Гэта таксама прапісана ў праграме нашай ініцыятывы. У найбліжэйшы час запросім ўсіх на свята.

Цэнтр для хлебапячэння можа стаць добрым прафарыентацыйным цэнтрам для школьнікаў, але галоўнае яго прызначэнне — прыцягваць незанятае насельніцтва раёна з ліку ўразлівых катэгорый і навучыць іх не толькі пячы хлеб, але яшчэ і рэалізоўваць яго. Гэтыя веды дапамогуць навучыцца стабільна зарабляць на жыццё.

— Цікавасць ужо ёсць, — адзначае Мікалай Лапасін. — Мы марым, што ў будучыні нашу школу, а таксама школы суседніх раёнаў, з якімі мы сумесна рэалізоўваем праект, уключаць у гастранамічны маршрут, які зараз распрацоўваецца ў Магілёўскай вобласці. Будзем развіваць яшчэ і турыстычны кірунак. Сёння ўсё, што блізка славянскім народам, у тым ліку беларусам, — нашы традыцыі. А хлеб — адна з галоўных. Нічога нас так не аб'ядноўвае, як гэты просты прадукт. Летась ніхто не ведаў, што 17 верасня стане Днём народнага адзінства. І мы спецыяльна не падганялі пад свята наш праект. Усё атрымалася само сабой. Значыць, мы на правільным шляху.

### Ад кавярні на колах да гастранамічнай лаўкі

Невыпадкова спецыяльнасць «Кухар, кандытар» карыстаецца сярод іншых, якія можна атрымаць у Чэрыкаўскім прафесійным ліцэі № 11, нязменнай папулярнасцю. Бачылі б вы, якія творы кулінарнага мастацтва тут ствараюць! Некалькі гадоў таму ліцэй зрабіў невялічкую кавярню на колах. Пад яе прыстасавалі стары аўтобус. Пачысцілі, пафарбавалі і запрасілі на адкрыццё. Калі аўтобус спісалі, на змену яму прыйшла «Гастранамічная лаўка» — спецыяльная палатка, якой ліцэй карыстаецца падчас гарадскіх мерапрыемстваў. Да яе заўсёды чарга, бо больш смачных булачак, хот-догаў, смажанак, бліноў вы дакладна нідзе не знойдзеце.

— Калі аўтобус — наш экспромт, то пад гастранамічную лаўку мы атрымалі грант, калі ўдзельнічалі ў конкурсе рэгіянальных ініцыятыў у рамках праекта «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці», — удакладняе **дырэктар школы Алена КОЛАСАВА.**



На што здольныя настаўнікі і выхаванцы гэтай установы, можна ацаніць па выстаўцы страў у фае і кабінеце па спецтэхналогіі. Вочы разбягаюцца ад разнастайнасці аўтарскіх рашэнняў. Тут табе і бульбачка з гуркамі, і парася ў яблыках, і торты-альтанкі ў стылі барока. Рука так і цягнецца, каб нешта ўхапіць пакаштаваць.

— Вось і дзеці нашы адразу ж звяртаюць увагу на вырабы, — усміхаецца **старшы майстар Людміла ШАНЫГІНА.** — Зараз у грамадскім харчаванні часцей выкарыстоўваюцца хімічныя напаўняльнікі, мы ж прымяняем выключна натуральныя. Тут няма з'едлівых колераў, усё прыроднае. І мы вучым выхаванцаў рабіць такую прыгажосць. Ёсць дзеці неверагодна таленавітыя.

Для Чэрыкаўскага раёна ліцэй — гэта своеасаблівы брэнд, як Дзень варэння і Цэнтр хлебапячэння, бо ўсе ведаюць, што гэта добрая школа для будучых прафесіяналаў. У савецкі час тут рыхтавалі кухараў дзіцячага харчавання. Паступаць сюды прыязджалі з усіх абласцей цэлымі групамі. Пераарыентавацца прыйшлося толькі пасля таго, як кухараў сталі ацэньваць па разрадах. Ліцэй стаў менш эксклюзіўным, але ў якасці падрыхтоўкі толькі памацнеў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва**
**Мікалая ЛАПАСІНА,**
*г. Чэрыкаў.*

# ЛІЧБАВЫ ЛАГЕР:
## як не стаць яго вязнем?



**4 кастрычніка ў лічбавым свеце адбыўся самы глабальны тэхнічны збой за ўсю гісторыю. На працягу шасці гадзін «маўчалі» ўсе самыя папулярныя сацыяльныя сеткі і месенджары: людзі не маглі абменьвацца інфармацыяй, посціць фота, пакідаць каментарыі, ставіць лайкі. На праблемы з доступам да звыклага спосабу стасункаў скардзіліся мільёны карыстальнікаў ва ўсім свеце. Цяпер усе папулярныя сэрвісы працуюць у штатным рэжыме. І пакуль эксперты шукаюць прычыну гэтага здарэння, а кампаніі падлічваюць каласальныя страты, мы пагаворым пра тое, чым пагражае чалавеку татальнае панаванне інфармацыйных тэхналогій і як пазбегнуць лічбавай залежнасці. Мой суразмоўца нейрахірург, навуковы супрацоўнік РНПЦ анкалогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БЕЛМАПА Гумен Гурбаніджад ГУШАНГ. Падчас інтэрв'ю з доктарам мы добраахвотна адмовіліся ад карыстання смартфонамі і правялі паўтары гадзіны ў прыемнай і карыснай размове. Дачытайце наш матэрыял да канца, і вы даведаецеся, як дапамагчы сабе ў век інфармацыйных тэхналогій і якія інструменты ёсць у кожнага чалавека, каб праводзіць лічбавы дэтакс.**

***— У сучасным свеце інфармацыйныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца ўсюды, куды ні глянь. Наколькі гэта татальнае карыстанне гаджэтамі патрэбна ў нашым жыцці, а галоўнае, бяспечна для нашага здароўя?***

— Безумоўна, лічбавая рэальнасць мае два бакі медаля. Станоўчы бок датычыцца, перш за ўсё, сферы дакладных навук. Канкрэтна тых складаных вылічэнняў, якія раней прыходзілася выконваць чалавеку пры дапамозе доўгага разумовага працэсу на паперы і з алоўкам у руках. Гэта рашэнне шматузроўневых матэматычных і фізічных задач, інжынерныя разлікі, мадэляванне. Зараз жа пры дапамозе камп'ютараў са штучным інтэлектам гэтыя задачы вырашаюцца вельмі хутка, і верагоднасць памылкі зводзіцца практычна да нуля. У медыцыне, дзякуючы лічбавым тэхналогіям, мы можам больш дакладна ставіць дыягназы і праводзіць вельмі складаныя аперацыі. Што датычыцца нашага жыцця падчас пандэміі, то менавіта лічбавыя тэхналогіі дапамаглі адаптавацца ў новай рэальнасці. З'явіліся такія паняцці, як дыстанцыйная праца і навучанне. Без цеснага кантакту людзі могуць весці звыклы вобраз жыцця і пры гэтым мінімізаваць рызыку заражэння каранавірусам.

***— Безумоўна, гэта ўсё ідзе на карысць чалавеку. А ў чым сутнасць адмоўнага боку «лічбы» ў нашым жыцці?***

— Адмоўны бок датычыцца здароўя чалавека. І тут трэба асобна разглядаць фізіялагічны і псіхалагічны складнікі.

**Фізіялогія.** Са з'яўленнем смартфонаў, якія мы бясконца трымаем у руках, стала часцей узнікаць такое захворванне, як **артроз.** Справа ў тым, што вялікі палец на руцэ не разлічаны на ратацыю. Яго асноўная функцыя — хапальная. Так было закладзена нашай прыродай. І калі мы трымаем смартфон і гэтым пальцам бясконца гартаем старонкі, у выніку набываем запаленне сухажылляў кісці. Яшчэ адно вельмі распаўсюджанае цяпер захворванне — **астэахандроз пазваночніка.** Чалавек доўга сядзіць за камп'ютарам і, як правіла, знаходзячыся ў лічбавым свеце, не заўважае час і не кантралюе нагрузку на сваё цела. Пастаяннае перанапружанне шыйнага аддзела пазваночніка прыводзіць да парушэння кровазвароту. Гэта паскарае працэс старэння пазваночніка. Акрамя гэтага, часцей узнікае варыкоз — праблема пашырэння вен ніжніх канечнасцяў, што характэрызуецца цяжарам і ацёкамі ног. **Зніжэнне зроку.** Яркі экран і блізкая адлегласць паміж вачыма і гаджэтамі дае дадатковую нагрузку на вочы. Людзі раней пачынаюць карыстацца акулярамі. **Парушэнне сну.** Асабліва калі чалавек карыстаецца гаджэтам непасрэдна перад начным адпачынкам. Мірганне манітора і частая змена малюнкаў могуць выклікаць парушэнне фаз сну. І гэта далёка не ўсё. Як правіла, калі ў чалавека ўзнікаюць праблемы са здароўем, ён звяртаецца да доктара, каб ліквідаваць наступствы, а трэба перш за ўсё высвятляць прычыну.

**Псіхалогія.** Канешне, гэты складнік датычыцца моцнага ўздзеяння на наш галаўны мозг і мысленне. Лічбавая тэхналогія працуе такім чынам, каб выклікаць у чалавека залежнасць. Калі ён і хвіліны не можа правесці без гаджэта і віртуальнай рэальнасці, то, відавочна, мэта дасягнута. Сардэчна запрашаем у так званы лічбавы лагер! Гэты лагер мае свае асаблівасці: чалавек трапляе туды добраахвотна, стварае ў ім зону камфорту, па сваёй волі там знаходзіцца і не хоча ці не можа адтуль выйсці. Для лічбавага вязня ўзрост, пол, сацыяльны статус не маюць значэння: для ўсіх знойдзецца штосьці цікавае і прыцягальнае. Акрамя таго, у лічбавым лагеры чалавек можа быць такім, якім хоча, а не такім, якім ён з'яўляецца на самай справе. Што лепш: быць героем у сацыяльных сетках ці лузерам у рэальным жыцці? Адказ відавочны.



***— Якім чынам адбываецца ўздзеянне лічбавых тэхналогій на чалавека, што дзеля знаходжання ў віртуальнай рэальнасці мы гатовыя ахвяраваць самым дарагім, што ў нас ёсць, — часам, зносінамі, здароўем?***

— Навука даволі дакладна апісвае гэты механізм. Асноўную ролю ў ім адыгрывае **рэтыкулярная фармацыя.** Назва паходзіць ад лацінскіх слоў *reticulum — сетка, formation — утварэнне.* Рэтыкулярная фармацыя валодае шматлікімі важнымі для дзейнасці чалавека функцыямі. У межах нашай тэмы яе асноўная роля заключаецца ў фільтраванні інфармацыі, якая прыходзіць да нас. Вучоныя лічаць, што за дзень у наш галаўны мозг можа трапіць каля 30 гбайт інфармацыі. Справіцца з такім велізарным аб'ёмам нашаму галаўному мозгу дапамагае рэтыкулярная фармацыя. Як гэта працуе? Уявіце сітуацыю: на вуліцы размаўляюць два чалавекі, а побач з імі пачынае працаваць газонакасілка. Некалькі хвілін гук ад яе моцна раздражняе людзей, але яны працягваюць размову. Праз некаторы час перастаюць звяртаць увагу на гэты гук, хоць газонакасілка працягвае працаваць. Што адбылося? Рэтыкулярная фармацыя адфільтравала той гук, які для чалавека больш важны. У дадзеным выпадку гэта размова.

Што датычыцца механізму фільтравання інфармацыі, якая паступае ў нашую падсвядомасць, то ён больш складаны. Галаўны мозг мае асаблівасць у першую чаргу прапускаць тую інфармацыю, у якую ён больш верыць. Гэтую псіхічную функцыю ў сваіх карысных мэтах віртуозна выкарыстоўваюць стваральнікі рэкламы. Галоўная яе сутнасць заключаецца ў тым, каб людзі верылі, што, напрыклад, менавіта дадзеная зубная паста лепшая за іншыя. Далей вы ідзяце ў магазін і сярод дзясяткаў розных зубных паст выбіраеце менавіта тую, у эфектыўнасць якой вам дапамагла паверыць рэклама. Убачыўшы знаёмы цюбік, сігнал ад гэтай зубной пасты трапляе ў ваш галаўны мозг у першую чаргу. Такім чынам, вы яе набываеце. Вось так працуе рэтыкулярная фармацыя ў выпадку з успрыманнем інфармацыі.

***— Такім чынам, атрымліваецца, што дзякуючы пэўнай інфармацыі чалавека можна замбіраваць і нават маніпуляваць яго паводзінамі?***

— Дакладна так і ёсць. Калі чалавек трапляе ў так званы лічбавы лагер, мяняюцца яго паводзіны. Ён пачынае залежаць ад той крыніцы інфармацыі, якой давярае больш за ўсё. У сучасным свеце за гэты давер людзей разгарнулася сапраўдная вайна. Дзякуючы тэхналогіям, можна лёгка ўвайсці ў ваш дом, асабістае жыццё і паўплываць на мысленне і паводзіны. Уявіце: на працягу пэўнага часу чалавек татальна давярае толькі адной крыніцы інфармацыі. Праз некаторы час ён губляе адну з галоўных якасцяў галаўнога мозгу — крытычнае мысленне — і пачынае думаць тунэльна. Гэта значыць, бачыць жыццё і звязаныя з ім праблемы вельмі вузка. Згадзіцеся, падпарадкаваць такога чалавека пэўным карысліві мэтам, матываваць яго на пэўныя дзеянні становіцца вельмі проста.

***— Ці можна нейкім чынам супрацьстаяць інфармацыйным маніпуляцыям?***

— Трэба навучыцца кантраляваць рэтыкулярную фармацыю галаўнога мозгу. Збавенне ад праблемы пачынаецца з яе асэнсавання. Пасля гэтага варта звярнуцца да лічбавага дэтаксу ці ачышчэння. Неабходна заблакіраваць лічбавае ўздзеянне на галаўны мозг і адключыць сябе ад шаблонных паводзін. Не шукаць адказы на ўсе пытанні і праблемы ў інтэрнэт-прасторы, а пачаць думаць самастойна. Акрамя таго, браць інфармацыю не з адной, а з розных крыніц. Такім чынам, вы дапаможаце сабе захаваць навыкі крытычнага мыслення і будзеце атрымліваць больш карыснай інфармацыі.

***— Каму патрэбны лічбавы дэтакс і што дае нам гэтая працэдура?***

— Ён патрэбен усім, бо сёння няма людзей, якія хадзілі б без смартфона. Але ж у першую чаргу лічбавае ачышчэнне патрэбна дзецям. Згодна са статыстыкай, у 2018 годзе 56 % дзяцей у свеце пастаянна знаходзіліся ў інтэрнэце. І з кожным годам гэтая лічба павялічваецца. І тут менавіта бацькі дапамагаць сваім дзецям вылучаць правільныя жыццёвыя арыенціры, каб зразумець, што добра, а што дрэнна, чым рэальны свет адрозніваецца ад віртуальнага. Акрамя таго, лічбавы дэтакс дае нам паляпшэнне самаадчування і эмацыянальнага стану. З'яўляецца новы погляд на звыклыя рэчы. Мы становімся больш эфектыўнымі і актыўнымі ў сваёй дзейнасці.

***— Якім чынам праводзіць лічбавы дэтакс?***

— Пры наяўнасці дрэнных звычак з імі трэба змагацца. Асноўнае — гэта абмежаванні і самакантроль. Калі чалавек дарослы, усё ў яго руках.

***— Заплануйце лічбавы дэтакс. Выберыце час, калі адсутнасць гаджэтаў не будзе для вас праблемай. Адпачынак дома, заняткі ў спартзале, прагулка ў парку, адпачынак на марскім узбярэжжы. Месца не мае значэння!***

— Адключыце ўсе гаджэты. Паступленне інфармацыі ў галаўны мозг падчас дэтаксу неабходна выключыць цалкам, а не запаволіць. Не забудзьце папярэдзіць сваіх родных, што пэўны час з вамі не будзе сувязі. Аптымальна забараніць сабе раніцай і ўвечары на працягу 1,5—2 гадзін дакранацца да камп'ютара ці смартфона. Працягласць перыядаў без гаджэтаў можна паступова павялічваць. Такім чынам, вы зразумееце, што без інтэрнэту нічога жахлівага ў вашым жыцці не адбываецца.

***— Перайдзіце да рэальных спраў. Займіцеся тым, што прынясе карысць вам і вашым блізкім. Калі вы мама, больш часу і ўвагі ўдзяліце дзецям. Калі вы муж, правядзіце гэты час з сям'ёй. Калі ёсць жаданне прысвяціць гэты час выключна сабе, займіцеся тымі справамі, якія даюць вам энергію, расслабляюць, напаўняюць пазітывам і новымі эмоцыямі. Гэта можа быць спорт, чытанне кніг, кулінарыя, рэальная сустрэча з сябрамі.***

— Часова замяніце смартфон на кнопачны тэлефон. Калі падчас лічбавага дэтаксу (у адпачынку ці на прагулцы ў парку) вам жыццёва неабходна быць на сувязі, вазьміце з сабой кнопачны тэлефон. Такім чынам, вы дадзіце сабе магчымасць адпачыць ад віртуальнага свету і ўсё роўна застанецеся на сувязі. Каму трэба, той патэлефануе!

***— Не адмяняйце лічбавы дэтакс. Калі вы не можаце абысціся без інтэрнэту на працягу 1,5—2 гадзін, выдзеліце хоць бы 30 хвілін. Памятайце, што сістэматычнасць вашых дзеянняў пойдзе вам на карысць.***

— Не кідайцеся на смартфон. Пасля лічбавага дэтаксу не вядзіце сябе як галодны чалавек, якога не карміліі некалькі дзён. Калі няма неабходнасці «завісаць» у інтэрнэце, то і не трэба.

***P. S.*** *Адмовіўшыся ад смартфонаў на паўтары гадзіны, доктар і журналіст пераканаліся: зямля па-ранейшаму круціцца, жыццё цудоўнае, і яно працягваецца. Ніякія лічбавыя тэхналогіі не заменяць духмяны водар гарачай кавы, цудоўны смак шакаладнай цукеркі і жывыя зносіны, якія даюць нам не толькі новыя веды, але і неверагодныя эмоцыі і добры настрой!*

**Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**



# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

8 кастрычніка 2021 г. № 39 (624)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


СЕСІЯ

## УЗВАЖАНЫ І ПРАФЕСІЙНЫ ПАДЫХОД



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.





**На шостай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання сенатары разгледзелі шэраг важных законапраектаў і іншых пытанняў.**

### Пра адзіны дзень галасавання

На сесіі быў зацверджаны законапраект аб змяненні Канстытуцыі, які прадугледжвае ўвядзенне адзінага дня галасавання. Плануецца, што ўпершыню ён пройдзе ў 2023 годзе, калі грамадзяне Беларусі будуць адначасова выбіраць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў.

Неабходнасць змен у Асноўны Закон дзяржавы абгрунтаваў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ.** Паводле яго слоў, ініцыятыва аб унясенні змен была выказана ў звароце дэпутацкага корпуса да кіраўніка дзяржавы пра неабходнасць унясення змяненняў у дзеючую рэдакцыю Канстытуцыі па ўвядзенні адзінага дня галасавання. Гэтая ініцыятыва выспела ў выніку правядзення дыялогавых пляцовак, зваротаў у грамадскія прыёмныя грамадзян, пісьмовых зваротаў.

стар. 8

ДЭПУТАТЫ, НА ВЫЕЗД!

## ДОМ ДЛЯ СВЯТАЎ, ТВОРЧАСЦІ І АДПАЧЫНКУ

### не павінен прастойваць

**Як з карысцю правесці вольны час у вёсцы? На прыкладах з жыцця вяскоўцаў Гомельскага раёна гэтае пытанне прааналізавалі дэпутаты. Установы культуры сельскіх населеных пунктаў раёна наведалі ўдзельнікі выязнога пасяджэння Пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях, справах моладзі, спорце і турызме Гомельскага раённага Савета дэпутатаў.**

Адзін з асноўных крытэрыяў у ацэнцы работы сельскіх дамоў культуры — сумесныя праекты з моладдзю і для моладзі. У Гомельскім раёне пражывае каля 13 тысяч маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года. Адзначаную катэгорыю насельніцтва вельмі важна далучыць да змястоўнай, карыснай арганізацыі свайго вольнага часу. У гэтым упэўнены работнікі раённага цэнтра культуры і яго філіялаў, спецыялісты раённага гісторыка-краязнаўчага музея, сельскія бібліятэкары і педагогі дзіцячых школ мастацтваў (іх у раёне сем). Дарэчы, у клубных установах раёна змястоўны вольны час для моладзі арганізоўвае 115 розных па профілі фарміраванняў, у якіх займаецца больш за 1300 дзяцей і падлеткаў.

стар. 17



Фота Цэнтра культуры Гомельскага раёна.

Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар ЗАВАЛЕЙ *(у цэнтры)* падчас наведвання Чарацянскага Дома культуры.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Сустрэча з украінскімі палітыкамі

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з украінскімі палітыкамі: Аляксандрам Марозам, Аляксеем Бeражным і Васілём Цушко.**

У размове яна адзначыла, што візіт у Беларусь дасць ім магчымасць азнаёміцца з рэальнай сітуацыяй. Паводле яе слоў, пэўныя падзеі, якія адбыліся ў Беларусі летась, не могуць не турбаваць. Вядомая рэакцыя некаторых краін на дадзеную сітуацыю. Таму лепш на свае вочы ўбачыць тое, што на самай справе адбываецца, каб данесці рэальную інфармацыю пра нашу краіну людзям цвярозага розуму ва Украіне, сказала спікер верхняй палаты парламента.

Госці ў час сустрэчы падкрэслілі: стварэнне ва Украіне ўяўлення аб нашай краіне моцна адрозніваецца ад рэальнасці. А так не павінна быць. Трэба выкарыстоўваць метады народнай дыпламатыі.

Экс-спікер Вярхоўнай Рады Украіны Аляксандр Мароз звярнуў увагу на тое, што Беларусь за апошнія гады стала домам для многіх яго суайчыннікаў, і падзякаваў беларускаму боку за падтрымку.

## Маніторынг цэн працягнецца

**Адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Сенатары абмеркавалі ход работы над шэрагам важных законапраектаў і іншых актуальных пытанняў, вырашэнне якіх непасрэдна ці ўскосна закранае штодзённае жыццё значнай часткі насельніцтва краіны.**

У прыватнасці, сенатары прааналізавалі вынікі работы Пастаяннай камісіі са зваротамі грамадзян за III квартал бягучага года, таксама разгледзелі папярэднія вынікі чарговага штомесячнага маніторынгу цэн на прадукты харчавання і лекавыя прэпараты. Былі зроблены адпаведныя высновы. Вырашана аднадушна: маніторынг цэн у краіне працягнецца.

## На з'ездзе адвакатаў Кыргызстана

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктар ЧАЙЧЫЦ і член гэтай камісіі, старшыня Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў Тамара ШАТЛІКАВА ўдзельнічалі ў II з'ездзе адвакатаў Кыргызстана.**

У сваім выступленні Віктар Чайчыц адзначыў, што адвакаты і дзяржава вырашаюць агульныя задачы па абароне інтарэсаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, падзяліўся досведам Беларусі па развіцці адвакацкай супольнасці. Разам з іншымі замежнымі гасцямі ён звярнуў увагу на значнасць адвакатуры ў абароне суверэнітэту кожнай дзяржавы, умацаванні міру і супрацоўніцтва паміж краінамі.

## Мацнеюць сувязі з Прымор'ем

**З 5 да 10 кастрычніка член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дырэктар славутай «Камунаркі» Сяргей АНЮХОЎСКІ знаходзіцца ва Уладзівастоку.**

Там ён працуе на фестывалі-кірмашы беларускай прадукцыі. У сталіцы Прыморскага краю адзінаццаць вядомых беларускіх вытворцаў прадстаўляюць сваю мясную і малочную прадукцыю, розныя прысмакі, тэкстыль, сельгастэхніку, іншыя вырабы.

Мэта камандзіроўкі сенатара — садзейнічанне развіццю гандлёва-эканамічных адносін паміж Прымор'ем і рэгіёнамі Беларусі.

У КУЛУАРАХ

# Тэма выстаўкі — сельсаветы

**Як вядома, сенатары актыўна працуюць не толькі ў зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі, у пастаянных камісіях, але і ў кулуарах сесіі.**



Падчас сесіі сенатараў чакаў прыемны сюрпрыз: у фае залы пасяджэнняў верхняй палаты парламента была разгорнута выстаўка, прысвечаная шматграннай дзейнасці сельскіх і гарадскіх Саветаў дэпутатаў. На стэндах былі прадстаўлены выданні з усіх рэгіёнаў краіны. У гэтых друкаваных альбомах і буклетах абагульняўся варты пераймання досвед, зразумела, з творчым пераасэнсаваннем і ўлікам мясцовых асаблівасцяў канкрэтнай тэрыторыі.



Асобныя выданні, напрыклад з Мінскай вобласці, вылучаліся і прывабным знешнім выглядам, і змястоўным тэкстам. Скажам, гэта датычыцца шэрага сельскіх Саветаў Валожынскага раёна. Дастойна былі рэпрэзентаваны сельсаветы Брэсцкай і іншых абласцей краіны.

Выстаўка выклікала інтарэс у сенатараў і запрошаных да ўдзелу ў сесіі, у прыватнасці, старшынь абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў. Яны актыўна гарталі маляўнічыя выданні, знаходзілі там цікавую і карысную для сябе інфармацыю, копіі дакументаў, лаканічныя аповеды пра асобныя падзеі, мерапрыемствы і акцыі, параўноўвалі іх сцэнарыі і арганізацыю з практыкай работы сельскіх Саветаў у сваіх рэгіёнах.

На здымках нашага фотакарэспандэнта адлюстраваны асобныя моманты знаёмства ўдзельнікаў сесіі з экспазіцыяй выстаўкі, якая была падрыхтавана намаганнямі супрацоўнікаў сакратарыята Савета Рэспублікі.

**Леанід ТУГАРЫН.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# УЗВАЖАНЫ І ПРАФЕСІЙНЫ ПАДЫХОД

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Сенатар падкрэсліў, што Прэзідэнт падтрымаў ініцыятыву дэпутацкага корпуса. А сам факт фармалізацыі гэтай ініцыятывы адбыўся ў рамках вясновай сесіі. Тады, 25 чэрвеня, быў прыняты праект закона аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю, у адпаведнасці з якімі ўводзіўся адзіны дзень галасавання і, адпаведна, падаўжаліся паўнамоцтвы дэпутатаў мясцовых Саветаў — да правядзення выбараў у Нацыянальны сход восьмага склікання, інакш кажучы, гэта канец 2023 года.

На думку Сяргея Сіўца, увядзенне адзінага дня галасавання будзе зручным для выбаршчыкаў і выгадным для дзяржавы, у прыватнасці, з фінансавага боку, бо любая электаральная кампанія, працяглая па сваёй сутнасці, справа не танная.

Сенатар звярнуў увагу на тое, што, згодна з патрабаваннямі дзеючай нормы арт. 138 Канстытуцыі, неабходны двухразовы разгляд праектаў змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю з прамежкам не менш чым тры месяцы паміж разглядамі. Гэта дазволіла парламентарыям яшчэ раз дасканала разгледзець прапанаваныя навацыі і абмеркаваць іх падчас сустрэч з грамадзянамі.

Старшыня пастаяннай камісіі падзяліўся ўражаннямі ад сустрэч у працоўных калектывах з гэтай нагоды: ён не знайшоў ні аднаго голасу супраць з боку грамадзян, ніводнага пярэчання. Такім чынам, можна гаварыць, што дадзеная норма ўспрынята грамадствам і яе ўкараненне пойдзе на карысць грамадства і дзяржавы.

**Сенатар Андрэй ІВАНЕЦ** выказаў думку, што ўвядзенне адзінага дня галасавання будзе садзейнічаць кансалідацыі грамадства ў цэлым, павысіць актыўнасць і адказнасць выбаршчыкаў у ходзе галасавання, спросціць механізм правядзення выбараў дэпутатаў усіх узроўняў.

**Сенатар Алег РАМАНАЎ** таксама падтрымаў ідэю ўвядзення адзінага дня галасавання. Ён адзначыў, што падчас правядзення дыялогавых пляцовак, у ходзе правядзення асабістых прыёмаў грамадзян, сустрэч з працоўнымі ў іх калектывах людзі неаднаразова выказвалі і абгрунтоўвалі прапановы на карысць новаўвядзення. А гэта сведчыць аб аднадушнай падтрымцы нашымі грамадзянамі



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

змен у практыцы арганізацыі выбарчага працэсу, што дазволіць павысіць актыўнасць выбаршчыкаў, знізіць нагрузку на выбарчыя камісіі і сэканоміць бюджэтныя сродкі на электаральную кампанію.

## Пра пагадненне аб рэадмісіі

Першым у абмеркаванні пытання «Аб прыпыненні дзеяння Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскім саюзам аб рэадмісіі асоб, якія знаходзяцца без дазволу» выступіў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.** Ён прадставіў законапраект, які, на думку сенатараў, стане адэкватным адказам на недружалюбныя дзеянні, прынятыя Еўрапейскім саюзам у дачыненні да Рэспублікі Беларусь.

Міністр, у прыватнасці, паведаміў, што пагадненне было падпісана ў студзені 2020 года ў Бруселі для вызначэння парадку перадачы і прыняцця асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны і дзяржаў — членаў ЕС з парушэннем парадку ўезду, выезду, знаходжання і пражывання замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. Дакумент ратыфікаваны Беларуссю 9 красавіка 2020 года і ўступіў у сілу з 1 ліпеня 2020 года.

Згодна з пагадненнем, кожны бок мае права часткова або цалкам прыпыніць часова яго дзеянне пасля папярэдніх кансультацый у Сумесным камітэце па рэадмісіі. Прыпыненне ўступае ў сілу на другі дзень, наступны за днём такога паведамлення. Іван Кубракоў падкрэсліў, што наш бок загадзя паведаміў у ЕС, што Беларуссю будуць прымацца пэўныя крокі. Гэтым дакументам прадугледжаны абавязацельствы як Беларусі, так і ЕС. «Каб не было ніякіх пытанняў да нашай краіны, мы абвясцілі, што прыпыняем дзеянне гэтага пагаднення, бо з боку Еўрапейскага саюза яно не выконваецца са жніўня 2020 года.

Таму на сёння мы прынялі такое рашэнне і зрабілі гэта сумленна і законна», — сказаў міністр.

Ён выказаў надзею, што прынятае дадзенага рашэння не прывядзе да негатыўных наступстваў фінансавага і эканамічнага характару. На яго думку, гэта мера часовая і дзеянне пагаднення будзе адноўлена пасля нармалізацыі двухбаковых адносін. «Мы гатовыя да зносін, гатовыя аднавіць дадзенае пагадненне, калі гэтага захочуць нашы суседзі па ЕС. Мы гатовыя працаваць, мы адкрытыя. Але хочам, каб была ўзаемапавага. На жаль, з боку ЕС мы гэтага не бачым», — канстатаваў міністр.

Іван Кубракоў таксама паведаміў, што сітуацыя з бежанцамі ў краіне знаходзіцца пад кантролем. Ніякіх праблемных пытанняў няма. Так, розныя Telegram-каналы распаўсюджваюць інфармацыю аб тым, што праз Беларусь праходзяць групы баевікоў, так званых нелегальных мігрантаў і гэтак далей. «Тут вам хачу сказаць як міністр унутраных спраў: праваахоўнікамі цалкам кантралюецца сітуацыя», — запэўніў Іван Кубракоў.

Міністр агучыў некаторыя лічбы. Напрыклад, на дзень яго выступлення на сесіі 368 бежанцаў звярнуліся па дапамогу, якая была аказана абсалютна ўсім. 56 чалавек, якія не мелі магчымасці размясціцца ў гасцініцах, забяспечыць сябе жыллём, таксама звярнуліся па дапамогу. Зараз на тэрыторыі Віцебскай і Гомельскай абласцей разгорнуты спецыяльныя пункты аказання матэрыяльнай і псіхалагічнай дапамогі бежанцам.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** у сваім выступленні ахарактарызаваў апошнія крокі Еўрапейскага саюза да Беларусі як несяброўскія і контрпрадукцыйныя. Гэта праявілася ў прыпыненні з боку ЕС супрацоўніцтва ў розных сферах узаемадзеяння, санкцыйным ціску на нашу краіну. Таму прыпыненне дзеяння Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскім саюзам аб рэадмісіі, з'яўляецца мерай вымушанай і адэкватнай. У гэтай сувязі члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы рэкамендуюць прыняць гэты законапраект, сказаў Сяргей Рачкоў. Прапанова была падтрымана сенатарамі аднадушна.

**Леанід ТУГАРЫН.**

ДАХОДЫ І РАСХОДЫ

# План напаўнення казны перавыканаы

**Тэмай пасяджэння прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў стала мабілізацыя даходаў у кансалідаваны бюджэт. Абмяркоўвалі і неабходнасць эканомнага расходавання бюджэтных сродкаў, кантролю за выкананнем падатковага заканадаўства.**

Як адзначыў **намеснік старшыні аблсавета Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ,** адпаведны кірунак работы мясцовай улады можна назваць эфектыўным. Адчувальных праблем з напаўненнем бюджэту няма.

Начальнік галоўнага фінансавага ўпраўлення Віцебскага аблвыканкама Генадзь Грэбнеў дадаў, што ў першым паўгоддзі бягучага года ў мясцовыя бюджэты Прыдзвінскага краю залічана 820,8 мільёна рублёў падатковых і непадатковых плацяжоў. План першага паўгоддзя выкананы на 101,2 %. І ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўласныя даходы павялічыліся на 15,8 %.

За кошт павелічэння мясцовымі Саветамі дэпутатаў ставак па падатках на ўласнасць у мясцовыя бюджэты паступіла 24,4 мільёна рублёў (3 % ад усіх паступленняў уласных даходаў), у тым ліку па падатку на нерухомасць — 17,5 мільёна рублёў, па падатку на зямлю — 6,9 мільёна. Дадзенае раённым і гарадскім выканаўчымі камітэтамі права па павелічэнні ставак па арэндных плацяжах дазволіла прыцягнуць у бюджэты 2,1 мільёна рублёў. У вобласці ўведзены ўсе прадугледжаныя заканадаўствам мясцовыя падаткі і зборы (курортны збор, збор з нарыхтоўшчыкаў і падатак за валоданне сабакамі), паступленні па іх склалі 0,6 мільёна рублёў. Найбольшыя з іх паступленні па курортным зборы — 0,4 мільёна рублёў.

Пэўная работа праводзіцца і па прыцягненні непадатковых даходаў. Паступленні даходаў ад размяшчэння часова свабодных грашовых сродкаў бюджэтаў на рахунках у банках за шэсць месяцаў склалі 2,3 мільёна рублёў. За студзень — чэрвень атрымана 2,3 мільёна рублёў даходаў у мясцовыя бюджэты ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці. І гэта больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, на 0,5 мільёна рублёў. Пры гэтым, паводле інфармацыі на пачатак чэрвеня, запазычанасць па пералічэнні ў мясцовыя бюджэты часткі арэнднай платы, атрыманай ад здачы ў арэнду дзяржаўнай маёмасці, склала 88,1 тысячы рублёў. І ў параўнанні з пачаткам года павялічылася на 15 тысяч. Ёсць запазычанасць і ад здачы ў арэнду рыбалоўных і паляўнічых угоддзяў — 73,3 тысячы рублёў. Усяго за першае паўгоддзе паступленні даходаў з гэтай «фінансавай крыніцы» склалі 157,4 тысячы рублёў. Асноўныя сумы запазычанасці ў Расонскім, Чашніцкім, Гарадоцкім і Ушацкім раёнах.

За студзень — чэрвень з кансалідаванага бюджэту вобласці прафінансаваны выдаткі на 1 456,1 мільёна рублёў. Асноўная частка бюджэтных сродкаў, або 68 %, забяспечвае ўтрыманне сацыяльна-культурнай сферы. У прыватнасці, больш за ўсё накіравана на ахову здароўя — 440,6 мільёна рублёў (30,3 % усіх выдаткаў бюджэту), адукацыю — 410,2 мільёна рублёў (28,1%).

Была агучана і фінансавая статыстыка па тэме COVID-19. Работнікам аховы здароўя і сацыяльнай абароны за працу ва ўмовах, звязаных з інфекцыямі дадатковыя выплаты да заработнай платы склалі ў першым паўгоддзі 76,6 мільёна рублёў, а ўсе выдаткі, звязаныя з процідзеяннем распаўсюджванню інфекцыі, — 87,7 мільёна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Сядзі і глядзі

# ГУЧНАЯ ПРЭМ'ЕРА ТЭЛЕСЕЗОНА

**На тэлеканале «Беларусь 1» 9 кастрычніка — доўгачаканая прэм'ера музычнага талент-шоу «X-Factor у Беларусі». Тут на працягу некалькіх месяцаў у прайм-тайме разверне́цца маштабнае творчае спаборніцтва, дзе ўдзельнікамі стануць таленавітыя, харызматычныя і шчырыя беларусы з усёй краіны.**



Ужо ў суботу ў 20.45 Белтэлерадыёкампанія прадставіць першы сезон сусветна знакамітай франшызы. Талент-шоу «X-Factor у Беларусі» стане жывой пляцоўкай для кранальных аповедаў, натхняльных сюжэтаў і асабістых перамог, якія ўражваюць. Заявіць пра сябе і свае вакальныя даныя на ўсю краіну, пераадолець комплексы і страхі, а таксама пазнаёміцца з выдатнымі прадстаўнікамі поп-індустрыі, адчуць падтрымку і сімпатыю тэлеаўдыторыі зможа кожны канкурсант. Цяпер галоўнае — правільна скарыстацца сваім шанцам, таму што з усіх жадаючых толькі некалькі соцень прэтэндэнтаў атрымала «шчаслівы білет» для ўдзелу ў папулярным шоу, якое для некага стане стартавай пляцоўкай у вялікае творчае жыццё.

Напярэдадні прэм'еры на афіцыйнай старонцы праекта ў Instagram @xfactorbelarus можна бліжэй пазнаёміцца з канкурсантамі і творчай групай праекта, а на YouTube-канале — пераглядзець выпускі відэадзённікаў, дзе шмат закадравага матэрыялу. Дарэчы, дзяліцца эксклюзівам у такім фармаце каманда будзе на працягу ўсяго сезона. Даведацца пра шоу можна таксама ў інфармацыйных праектах медыяхолдынга, у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» і ў эфіры Беларускага радыё.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 130

**Пайшоў з жыцця найстарэйшы беларускі шахматны кампазітар Уладзімір Пятровіч Сычоў (24.01.1936 — 20.09.2021).**

Ураджэнец вёскі Грудзінаўка Быхаўскага раёна, ён жыў у Мінску, па прафесіі быў майстрам-будаўніком, узводзіў шэраг сталічных аб'ектаў. Шахматамі захапіўся яшчэ ў школе дзякуючы настаўніку матэматыкі. З 1954 года займаўся рашэннем шахматных задач, потым пачаў складаць іх. Першы твор убачыў свет у 1958 годзе ў магілёўскай абласной газеце. З таго часу аўтар склаў звыш за 500 задач, атрымаў на конкурсах 75 прызоў і 190 водгукаў. У чэмпіянатах БССР і Беларусі восем разоў заваёўваў залатыя медалі, пяць — сярэбраныя, двойчы — бронзавыя. У складзе беларускай каманды неадночы быў чэмпіёнам СССР, паспяхова выступаў на камандных чэмпіянатах свету. Майстар спорту СССР, майстар ФІДЭ і міжнародны арбітр па кампазіцыі. З 1976 да 2002 года ўзначальваў рэспубліканскую камісію па шахматнай кампазіцыі. Аўтар кніг «Шахматная кампазіцыя ў Беларусі» (разам з М. Бельчыкавым і Я. Дзвізавым) і «250 выбраных шахматных кампазіцый». Вёў шахматныя аддзелы ў некалькіх выданнях, у тым ліку працяглы час — у нашай газеце.

Наступная задача Уладзіміра Сычова ўбачыла свет на старонках «Звязды» ў далёкім 1969 годзе **(гл. дыяграму)**.



**Белыя:** Крe4, Ла2, Ле3, Са7, Сс8, Kf2, пп. d3, h4 (8).

**Чорныя:** Kpg1, пп. е5, g2, h5 (4).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

У Чэлябінску на Мемарыяле Ігара Курносава па хуткіх шахматах (276 удзельнікаў) найлепшы вынік сярод беларусаў у Аляксея Фёдарава — 9-е месца. Сяргей Азараў — на 20-м месцы, Міхаіл Нікіценка — на 26-м, Кірыл Ступак — на 35-м, Аляксей Аляксандраў — на 44-м, Дзяніс Лазавік — на 47-м, Вячаслаў Зарубіцкі — на 48-м і г. д.

Сяргей Азараў — Вольга Бадэлька. 1. е4 е5 2. Kf3 Кc6 3. Cb5 Kf6 4. 0-0 К:е4 5. d4 Kd6 6. de К:b5 7. а4 Kbd4 8. К:d4 К:d4 9. Ф:d4 d6 10. Кc3 Се6 11. Лd1 Се7 12. ed Cf6 13. Фb4 cd 14. Л:d6 Фе7 15. Ке4 0-0 16. К:f6+ Ф:f6 17. Се3 Фf5 18. c3 b6 19. Лаd1 Лас8 20. Лб6d4 Фс2 21. h3 Лс4 22. Фе7 Л:d4 23. Л:d4 h6 24. Лb4 а5 25. Л:b6 Ф:а4 26. Cd4 Ле8 27. Фh4 Фd1+ 28. Kph2 Kph7 29. Фg3 Лg8 30. Фе5 Фd3 31. Ф:а5 Cf5 32. Фе5 Се6 33. b4 g5 34. Фf6 Фе4 35. f3 Фf4+ 36. Ф:f4 gf 37. Се5 Лс8 38. Лd6 Kpg6 39. b5 Kpf5 40. Cd4 Сс4 41. b6 Ле8 42. Лс6 Cd5 43. Лd6 Сс4 44. h4 Се6 45. с4, 1:0.

* * *

Аляксей Аляксандраў фінішаваў трэці на Мемарыяле Генрыха Чапукайціса ў Санкт-Пецярбургу (32 удзельнікі).

У анлайн-турніры памяці гомельскага трэнера Яўгена Фурсеева прызавую тройку склалі Максім Царук, Ягор Сіліч і Раман Леяйнаў.

Вольга Бадэлька ў складзе расійскай каманды «Паўднёвы Урал» выйграла жаночы Кубак Еўропы сярод шахматных клубаў, які прайшоў у Македоніі. На асабістым рахунку нашай суайчынніцы 4 перамогі і 2 нічыі.

Чэмпіёнам Брэсцкай вобласці ў пяты раз стаў Уладзіслаў Каташчук, а сярод жанчын перамагла Аляксандра Шабан. Чэмпіёнка краіны Аляксандра Тарасенка, якая летась выйграла мужчынскі чэмпіянат Брэстчыны, сёлета заняла ў ім другое месца.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Кр:с4. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сваё кіно

# Мультфільмы як навука пра жыццё

**Таццяна Кубліцкая — вядомы рэжысёр-пастаноўшчык і мастак-пастаноўшчык, сцэнарыст анімацыйнага кіно. Гледачам, думаю, няцяжка ўзгадаць яе мультфільмы, дзе і «Паданне пра гуслі», «Азбука небяспечнасцяў», «Піліпка», «Сараканожка», і шэраг іншых яскасных і цікавых работ. У іх пануюць дабрыня, шчырасць і любоў да людзей, традыцый і ўсяго жывога.**
**На наступным тыдні 12 кастрычніка іх стваральніца адзначыць свой 65-ы дзень нараджэння. А напярэдадні юбілею ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала выйдзе чарговы выпуск праграмы «Кадры жыцця», які будзе прысвечаны імяніннíцы. Таццяна Кубліцкая скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1981 годзе. Праз два гады, у 1983-м, пачала працаваць як мастак-пастаноўшчык анімацыйных фільмаў на кінастудыі «Беларусьфільм», а пасля з 2009 года стала рэалізоўваць сябе і як рэжысёр-аніматар. Прапаноўваем згадаць пяць работ творцы, якія варта глядзець і абмяркоўваць усёй сям'ёй.**



«Вясна ўвосень» (2015).

**1. «Паданне пра гуслі» (2019).**

Гісторыя пра маленькага хлопчыка, які адпраўляецца на пошукі свайго бацькі, што сышоў на бясконцую вайну. І вось юны герой знаходзіць цэлае войска, воіны якога рыхтуюцца да чарговага змагання. Тады, каб нагадаць рыцарам пра іх родных і любімых, пра мірнае жыццё і пакітутыя дамы, хлопчык пачынае іграць ім на гуслях...

**2. «Азбука небяспечнасцяў» (2016, 2018).**

Першая гісторыя пра маленькіх хатнічкаў і іх дзядулю, якія вучаць дзетак змагацца з беспарадкам і наводзіць чысціню, аберагаць сябе ад розных небяспек, хвароб, убачыла свет у 2016 годзе. А пасля ў 2018-м з'явіўся працяг прыгодніцкага мультфільма. ...Зіма. Хатнічкі Бакуня і Чаруша катаюцца на санках, якія ламаюцца падчас аднаго са спрытных з'ездаў. Тады нашы героі крочаць у хлеў па інструменты, каб адрамантаваць сапсаваную рэч. Аднак дамавічкі не заўважаюць і нават не падазраюць, што за імі назіраюць злая Мурза і яе слугі — павучкі. Яны і выкрадаюць Бакуню з Чарушам, каб тыя прыслужвалі і распавядалі казкі.



«Дзяўчынка з запалкамі» (1996).

**3. Вясна ўвосень (2015).**

Мультфільм зняты па матывах аднайменнай казкі Уладзіміра Караткевіча. ...Маленькі Янка цяжка захварэў. Адзінае, чаго хлопчыку вельмі хацелася, — убачыць сонейка, але дзень выдаўся непагодлівы. Тады сястра Янкі папрасіла сонейка паказацца, толькі яно не пачула дзяўчынку. А потым здарыўся цуд, бо птушкі і звяры, якіх маленькі хлопчык ніколі не крыўдзіў, прыйшлі Аленцы на дапамогу. Усе разам яны заспявалі вясеннія песенькі — і сонейка прачнулася!

**4. Дзяўчынка з запалкамі (1996).**

Экранізацыя па матывах аднайменнага апавядання Ханса Хрысціяна Андэрсена пра дзяўчынку-сірату, якая напярэдадні Раства вымушаная прадаваць запалкі, каб зарабіць сабе на кавалак хлеба. Але людзі, што займаюцца перадсвяточнымі турботамі, не заўважаюць болю і пакут маленькага чалавека. Яны праходзяць міма, каб хутчэй апынуцца ў сваіх утульных дамах, за святочным сталом. А дзіця пра гэта магло толькі марыць. Аднак часам адзіная мара дае надзею альбо збаўленне ад пакут...

**5. Дзіўная вячэра на Куццю (1999).**

Яшчэ адна гісторыя з тых, што здараюцца перад Калядамі. Як вядома, гэта час неверагодных падзей, калі спраўджваюцца мары. Так і гэтым разам, здавалася б, маленькая непрыемнасць з разбітым слоікам смятаны становіцца нагодай для хлопчыка і яго маці здзейсніць добры ўчынак. Яны разам дораць сапраўднае свята беспрытульным кацянятам.

Дарэчы, у год 50-годдзя беларускай мультыплікацыі Музей гісторыі беларускага кіно дае магчымасць сваім наведвальнікам пазнаёміцца з творчасцю вядучых майстроў Студыі анімацыйных фільмаў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». І з 2 да 31 кастрычніка 2021 года (па суботах, нядзелях ці па заказе) у кіназале музея дэманструецца персанальная рэтраспектыва найлепшых работ рэжысёра і мастака-пастаноўшчыка Таццяны Кубліцкай. Акрамя згаданых намі, у яе творчай біяграфіі ёсць яшчэ шмат адметных кінаработ, якія варта і цікава убачыць і дзецям, і дарослым.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.05** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Нішто не здараецца двойчы» (16+).**
**13.05, 15.25 Драма «Крытычны ўзрост» (12+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.50** Арэна.
**1.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.35** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**10.30** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.10** «На тыдзень» (16+).
**12.05 Трылер «Беглы ў лабірынце: лекі ад смерці» (12+).**
**14.45** «У пошуках Доры» (0+).
**16.30** «Стыч!» (6+)
**17.00** «Суперлато».
**17.40** «Арол і рэшка. Дзяўчаты» (16+).
**18.35** «Сакрэтны мільянер» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.20** Хачу ў тэлевізар!

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Кузьміцкі хлеб.
**8.05, 12.00, 19.40, 23.30** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 18.10 «Знайсці і абясшкодзіць». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.50** «Кадры жыцця». Мастакпастаноўшчык і рэжысёр-пастаноўшчык анімацыйнага кіно Таццяна Кубліцкая.
**11.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**12.20** «Беларуская кухня». Вушкі з грыбамі.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Серыял (12+) [СЦ].**
**15.35** «Навукаманія» (6+).
**16.00 «Прыдуркі». Маст. фільм (12+).**
**17.30** «Люблю і памятаю». Аўтарская праграма Уладзіміра Арлова. Народны артыст БССР, народны артыст СССР Мікалай Яроменка-ст.
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**05.55, 17.05, 23.35** Тэніс. ВТА.
**8.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ.
**9.55, 15.05** Футбол. Ліга нацый.
**11.55** Барацьба. Чэмпіянат свету.
**14.30** Піт-стоп.
**18.55** Хакей. КХЛ.
**21.35** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2022.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.15** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.40 Фільм «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**21.15** «Прапаганда» (16+).
**21.35 Фільм «Рускія горкі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40, 0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**11.35** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 20.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.30, 16.50 «Па законах ваеннага часу». Серыял (12+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**0.55** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.50** «Мінтранс» (16+).

## МІР

**5.00, 4.45** Спецыяльны рэпартаж (16+).
**5.10** «Еўразія. Спорт» (16+).
**5.20, 10.10 Серыял «Аддзел С.С.С.Р.» (16+)**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 4.00** Навіны. Бягучы радок.
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.00 Серыял «Даішнікі-2» (16+).**
**2.10** «Разам».
**3.10, 4.15** Мір. Думка (16+).
**3.25** «5 прычын застацца дома» (16+).
**3.35** «Культ асобы» (16+).
**3.50** «Еўразія ў трэндзе» (16+).
**3.55, 4.30** Мір. Спорт (16+).
**4.35** «Еўразія. Рэгіёны» (16+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**12.45** «У людзях».
**13.35** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны—Беларусь.
**14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Таямніца Ліліт» (12+).**
**23.10** «Лёс чалавека з Барысам Карчэўнікавым» (12+).
**0.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.10** «Здароўе» (12+).
**7.05** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**7.40, 8.25, 10.25 Драма «Ваўчынае сонца» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55 Серыял «Чужы раён» (16+).**
**16.20, 19.40, 21.45, 23.15** Сёння. Галоўнае.
**16.30** «За гранню» (16+).
**17.25** «ДНК» (16+).
**18.30, 19.55 Фільм «Ратавальнік» (16+).**
**21.50** «НЗ.by».
**22.10, 23.30 Дэтэктыў «Балабон-3» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.20, 17.15, 0.45, 21.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Трансформеры прайм» (6+).
**7.30, 14.25, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Цёмны крыштальль» (12+).**
**8.25 Серыял «Лок і ключы» (16+).**
**9.10, 15.00 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**9.55 Серыял «Інданезія» (12+).**
**10.45 Трылер «Выкуп» (16+).**
**12.45 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.30** Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
**14.50, 18.05** «Хачу ў Парыж» (12+).
**15.45 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**17.20 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.15 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (12+).**
**19.45 Серыял «МакМафія» (18+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Камедыя «Джэнтльмены» (18+).**
**23.05 Серыял «Мар'яна» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Раніца з гумарам». Дайджэст (16+).
**8.00** «Зала чакання» (16+).
**9.00** М/ф «Лекс і Плу» (6+).
**9.25** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.50** М/ф «Царэўны» (6+).
**10.20** «Рускія не смяюцца» (16+).
**11.25, 1.45** «Проста кухня» (16+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.50** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**13.20** Анімацыйны фільм «Хадзячы замак» (12+).
**15.50, 18.25** Серыял «Кухня» (16+).
**21.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**22.35** «Белабайкі» (16+).
**23.10** «Наш рамонт» (16+).
**23.55** «Кіно ў дэталях» (16+).
**0.50** «Рогаў у справе» (16+).
**2.15** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**3.25** «Даеш моладзь» (16+).
**5.05** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Вялікія міфы. Адысея». Серыял.
**7.05** «Казка пра цара Салтана». Мультфільм.
**8.10** «Вялікія і маленькія».
**10.00** «Мы — грамацеі!»
**10.45** «Матрос сышоў на бераг». Маст. фільм.
**12.00** «Першыя ў свеце». Серыял.
**12.15** Лісты з правінцыі [СЦ].
**12.45** Дыялогі пра жывёл [СЦ].
**13.25** Неўскі каўчэг [СЦ].
**13.55** «Абсалютны слых».
**14.35** «Гульня ў бісер».
**15.20** «Ахоўвай мяне, мой талісман». Маст. фільм [СЦ].
**16.30** «Карціна свету з Міхаілам Кавальчуком».
**17.15** «Пешшу. Іншая справа» [СЦ].
**17.45** «Скрыпічны Сусвет Віктара Траццякова». Дак. фільм.
**18.30** «Рамантыка раманса».
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «У порце».
**21.55** Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра.
**23.40** «Казкі... Казкі... Казкі старога Арбата». Маст. фільм [СЦ].
**1.25** «Леў і 9 гіен», «Казка пра дурнаватага мужа», «О мора, мора!». Мультфільмы для дарослых.
**2.00** Прафілактыка на тэлеканале.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» (16+)
**7.00, 8.35, 9.40, 11.40, 18.55, 21.40, 00.55, 2.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.15** Маст. фільм «Яма» (18+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.00, 17.25, 20.20** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Мы з Урала» (12+).
**13.25** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Гараж, ці Ноч у музеі» (16+).
**14.05** «Рок і вакол яго» (16+).
**15.00** «Быў час» (16+).
**16.00** Маст. фільм «Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца» (18+).
**18.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**19.20** «Навагодні паказ» (12+).
**21.50** Маст. фільм «Дзесяць негрыцянят» (18+).
**0.00** «Яловая субмарына» (18+).
**1.20** Маст. фільм «Першы тралейбус» (16+).



**3.00** «Мінулы час» (12+).

## EuroSport 1

**0.30** Конны спорт. Global Champions Tour (6+).
**1.30** Веласпорт. «Гран-пры Плюмлека і Марбіяна». Мужчыны (16+).
**2.30** Аўтагонкі на цягавітасць (16+).
**4.00, 5.00, 7.00, 12.30, 13.45, 14.45, 19.30, 20.45** Снукер. Northern Ireland Open (6+).
**6.00** Тэлечасопіс «За-ла славы: Токія-2020» (16+).
**8.00, 8.45, 11.30, 18.05** Лёгкая атлетыка (16+).
**18.00, 20.40** Навіны (16+).

## Кінакамедыя

**1.25** «Браты з Грымсбі» (18+).
**3.25, 11.35** «Крымінальная фішка ад Генры» (16+).



**5.25** «Пакуль вяселле не разлучыць нас» (12+).
**7.35, 23.00** «Монтэ-Карла» (6+).
**9.35** «Халоп» (12+).
**13.35** «2 + 1» (16+).
**15.45** «Порнаходжы, або Мілка, як ты» (18+).
**17.30** «Чаго хоча дзяўчына» (12+).
**19.30** «Мужчына з гарантыяй» (16+).
**21.05** «Сужэнцы Морган ва ўцёках» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.15** «Улегцы» (12+).
**8.50** «Дрэвы на асфальце» (12+).
**10.30, 23.45** «Глядзі сам» (16+).
**10.45** «Самы смачны дзень» (6+).
**11.20** «Паляванне на гаўляйтара» (16+).
**15.45** «Добры дзень з Валерыяй» (12+).
**16.45** «Як прыручыць дракона-2». Анімацыйны фільм (0+).
**18.30, 5.10** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**19.35** «Шэрлакі» (16+).
**21.00** «Адвакат Д'ябла» (16+).
**0.00** «Споведзь экстрасэнса» (12+).
**0.55** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**3.55** «Гэта рэальная гісторыя» (16+).
**4.45** «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)

## ТБ1000

**5.00** Глыбокае сіняе мора (16+).
**6.35, 3.50** Таямнічы лес (12+).
**8.25** Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў (18+).
**10.40** Сталёвыя магноліі (6+).
**12.55** Мачаха (12+).
**15.10** Цуд (12+).
**17.10** Мільянер паняволі (12+).



**19.00** Прыкіньса маёй жонкай (16+).
**21.05** Іспанская-англійская (12+).
**23.30** Кіраванне гневам (12+).
**1.25** Зніклая (18+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.40, 7.55, 9.05** Вязень замка Іф (12+).
**10.55** Белы снег (6+).
**13.15** Адзін удых (12+).
**15.05** На вастры (12+).
**17.10, 19.00** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**20.40** Усё пра мужчын (16+).
**22.10** Хандра (16+).
**0.05** Зацьменне (12+).
**1.30** Былая (18+).
**2.55** Цой (16+).
**4.20** Пятніца (16+).

## National Geographic

**6.00, 7.10** Навуковыя глупствы (16+).
**6.20, 6.45** Гульні розуму (16+).
**8.00, 8.30** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**8.55, 9.50** Мегазлом (16+).
**10.45, 11.35** Сапраўдны суперкар (16+).
**12.25, 13.15** Непакорлівы вострaў (16+).
**14.05, 14.55, 15.50, 16.40, 17.35** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**18.25** Адкрытая Атлантыда (16+).
**20.10, 21.00, 21.50** Дзікі тунец (16+).
**22.40** Асушэнне Алькатраса (16+).
**23.35, 00.30** Аўта-SOS (16+).
**1.15** Невядомая планета Зямля (16+).
**2.00, 2.45** Асушыць акіян (16+).
**3.35** Невядомая планета Зямля (16+).
**4.25, 5.15** Вострaў бунтароў (16+).

## Discovery

**8.00, 20.20, 7.35** Як гэта зроблена? (16+)
**8.25, 8.50, 9.20, 9.45, 10.15, 10.40, 19.50** Як гэта ўладкавана? (12+)
**11.10, 12.05, 13.55** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.00** Касмічныя забойцы (16+).
**14.50, 15.15, 15.45, 16.10** Кафэ, закусачныя і забегалаўкі (12+).
**16.40** Голы і напалоханыя XL (16+).
**18.30** Аўтабан А8 (12+).
**19.25** Прыгожае жыццё (12+).
**21.15** Смяротны ўлоў (16+).
**22.10** Аляска: апошні рубеж (16+).
**23.05** Сталёвыя хлопцы (12+).
**0.00, 00.25** Білі скупляе Бруклін (12+).
**0.55** Металаломшчыкі (16+).
**1.50** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**4.27, 6.01** Махінатары (12+).
**6.48** На драйве з Мішэль Радрыгес (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.10 Драма «Лабірынт» (16+).**
7.55 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 “Арсенал» (12+).
9.40 Гісторыі выратавання (12+).
10.20 Зона Х (16+).
10.50 Маршрут пабудаваны (12+).
11.30 «Пытанне нумар адзін».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Драма «Калі ты мне даруеш» (16+).**
14.25 Адзін дзень (12+).
15.15 Вакол планеты.
16.00 «Нагода ёсць» (12+).
**16.40 «Партызанскі рубеж». Маст. фільм (12+).**
**16.55 Драма «Давай развядзёмся» (16+).**
18.50 Навіны надвор'я.
19.15, 20.45 «Х-Фактар».
19.30 Галоўны эфір.
**23.40 Драма «Садовае кольца».**

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
8.00, 19.35 Тэлебарометр.
**8.05 «Клон». Серыял (16+).**
10.00 «Стыч!» (6+)
10.45 «Тры першыя спатканні» (16+).
**11.45 Камедыя «Доктар Дулітл-2» (12+).**
13.25 «На нажах» (16+).
14.30 «Тата папаў» (16+).
16.35 «Вежа» (12+).
**17.30 «Тэрмінатар: ды прыйдзе збавіцель» (16+).**
20.05 «Арол і рэшка. Дзяўчаты» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.20 Камедыя «Пікселі» (12+).**
23.15 «Карані палат» (16+).

## Беларусь 3

7.30 «Кошкін дом». М/ф (6+).
8.00 «Святыні Беларусі».
8.30, 13.50 Навіны культуры.
**8.45 «Мая Анфіса». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Тушаная рэпа і салата з лебяды.
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.50 «Сваімі словамі».
**12.30 «Замарожаны». Маст. фільм (12+).**
14.10 І. Кальман. «Сільва». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.
**16.15 «Салдат Іван Броўкін». Маст. фільм (12+).**
17.45 «Кадры жыцця». Палітык, пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Мікалай Чаргінец.
**18.40 «Дзве нядзелі». Маст. фільм (12+).**
20.10 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «МУР». Серыял (16+) [СЦ].**

## Беларусь 5

6.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі.
8.55 Сняданак чэмпіёна.
9.25 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ.
11.10 Піт-стоп.
11.45 Лёгкая атлетыка. Паўмарафон. Мужчыны. Жанчыны.
13.00 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
14.50, 19.20 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі.
16.50 Хакей. КХЛ.
21.20 Футбол. Чэмпіянат Беларусі.
22.05 Мастацкая гімнастыка. Этап кубка свету.
23.05 Тэніс. ВТА.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ] Нашы навіны.
7.10 «Здароўе» (16+).
8.10 «Жыццё іншых» (12+).
9.10 «Метэагід».
9.30 «Раніца за вечар мудрэйшая» (12+).
10.05 «Савелій Крамараў. Джэнтльмен удачы. Смешны да слёз» (12+).
11.05 «Бачылі відэа?» (6+)
**14.05 Фільм «Аазіс кахання» (16+).**
16.20 «Тры акорды» (16+).
18.15 «Лепш за ўсіх!» (0+)
20.00 Контуры.
21.35 «Што? Дзе? Калі?» (16+)
22.50 «Спартклуб» (16+).
**23.10 Фільм «Позні тэрмін» (16+).**
**1.05 Фільм «Забойная сіла» (16+).**

## СТБ

**6.40, 0.30 «Халасцякі». Серыял (16+).**
8.10 «Ці ведаеце вы, што?» (16+)
9.05 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
11.00 «Невядомая гісторыя» (16+).
**11.50, 13.40, 16.40 «Па законах ваеннага часу-2». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
21.15 Дакументальны спецпраект (16+).
22.50 «Засакрэчаныя спісы» (16+).
1.55 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Ціхі Дон» (16+).**
6.20 М/ф.
**7.05 Маст. фільм «Зайчык» (16+).**
8.50 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (16+).
9.25 «ФазэндаЛайф» (16+).
10.00, 16.00 Навіны. Бягучы радок.
**10.10, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Знахар» [СЦ] (16+).**
18.30, 0.00 «Разам».
4.10 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові». «Ціхі Дон» (16+).
**4.40 Маст. фільм «Ціхі Дон» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.05 Маст. фільм «Дырэктар па шчасці» (12+).**
10.40 «Ранішняя пошта з Мікалаем Басковым».
**11.15 Маст. фільм «Клуб падманутых жонак» (12+).**
14.50 «Парад гумару» (16+).
**16.25 Маст. фільм «Саната для Веры» (12+).**
20.00 Весткі тыдня.
21.05 «У людзях».
**21.50 Маст.фільм «Мой белы і пухнаты» (12+).**
23.30 Масква. Крэмль. Пуцін.
0.10 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 «Гарады Беларусі» (6+).
6.45 Беларусы (6+).
7.25 «50 рэцэптаў першага» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Погляд на Беларусь» (12+).
8.40 «Хто ў доме гаспадар?» (12+)
9.20 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.20 «Кватэрнае пытанне.by» (12+).
10.55 «Першая перадача» (16+).
11.25 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.15 «Дачны адказ» (0+).
13.15 «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05 Драма «Ваўчынае сонца» (16+).**



16.20 «Следства вялі...» (16+)
19.00 «Вынікі тыдня».
20.05 «Ты не паверыш!» (16+)
21.10 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**22.15 Фільм «Мая рэвалюцыя» (16+).**

## 8 канал

7.00, 13.45, 20.00, 21.15, 0.55 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рок Дог» (6+).
8.30 Док. фільм «Пакістан» (12+).
9.20 «Хачу ў Парыж» (12+).
9.25 «Гатуй як шэф» (12+).
**9.40 Серыял «Шторм» (18+).**
13.50 «Том і Джэры ў Нью-Ёрку» (6+).
14.15 Мультфільм «Рок Дог-2» (6+).
**15.45 Прыгоды «Пэры Джэксан і Мора пачвар».**
**17.35 Дэтэктыў «Інспектар Морс» (16+).**
19.15 «Суперлато».
**20.05 Серыял «Электрычныя сны Філіпа К. Дзіка» (16+).**
21.00 «Вечарніца» (0+).
**21.20 Баявік «Лара Крофт: раскрадальніца магільняў».**



## ВТБ

**6.05, 14.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.00, 23.05** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**10.50, 0.00** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**12.55** «Уральскія пельмені» (16+).
**16.00** Серыял «Гатовыя на ўсё» (16+).
**17.00** Серыял «Гранд» (16+).
**20.00** Серыял «Жонка алігарха» (16+).
**21.00** Фантастыка «Філосафы: урокі выжывання». (16+).
**1.00** Серыял «Анжаліка» (16+).
**2.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**3.35** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Неўскі каўчэг [СЦ].
**7.35, 18.25** Колер часу.
**7.45** «Той самы Мюнхгаўзен». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** XX стагоддзе.
**12.10** «Першыя ў свеце». Серыял.
**12.25** «Шахеразада». Серыял.
**13.30** «Паўночнае ззянне Ірыны Мятліцкай». Дак. фільм [СЦ].
**14.15** «Забытае рамяство». Серыял.
**14.30** «Сімон Шноль. Ад 0 да 80». Серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. АРТ.
**15.20** «Агора».
**16.25** «Сузор'е «Майскіх хрушчоў». Дак. фільм [СЦ].
**17.20, 2.30** Раман у камені.
**17.50, 1.50** Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.
**18.35** Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Сімфанічны раман». Серыял [СЦ].
**21.30** «Сацi. Нясумная класіка...»
**22.15** «Аптымісты». Серыял.
**23.10** «Рассакрэчаная гісторыя». Серыял [СЦ].
**1.00** «Убачыць пачатак часоў». Дак. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
**7.30** «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)
**9.00** «Быў час» (16+).
**10.00** Маст. фільм «Калі можаш, прабач...» (16+)
**11.20, 17.20, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**12.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**12.55, 14.40, 15.40, 19.05, 20.25, 21.40, 23.00, 1.00, 2.45, 3.40, 5.45** Музычная настальгія (12+).
**13.10** «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
**14.05** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Беражыся аўтамабіля» (12+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00** Маст. фільм «Год цяля» (18+).
**18.00** «СеўАлогія» (18+).
**19.20** Маст. фільм «Мой лёс» (16+).
**0.00** «Да і пасля...» (16+)
**1.20** Маст. фільм «Ваенна-палявы раман» (16+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

## EuroSport 1

**1.00, 20.40** Навіны (16+).
**1.05, 1.45** Кузаўныя аўтагонкі. Кубак свету (16+).
**2.30** Лёгкая атлетыка. Чыкагскі марафон (6+).
**4.00** Веласпорт. «Тур дэ Вандэя». Мужчыны (16+).
**5.00** Веласпорт. «Парыж-Тур». Мужчыны (16+).
**6.00** Тэлечасопіс «Зала славы» (16+).
**7.00, 9.30, 13.30, 14.45, 20.00, 20.45** Снукер. Northern Ireland Open (6+).
**8.00, 11.40** Веласпорт. «Тур Ламбардыі». Мужчыны (16+).
**10.25** Стральба з лука. Топ-5 (16+).
**10.30, 11.00, 11.30** Стральба з лука. Кубак свету (16+).
**11.35** The Minute (16+).
**12.30** Тэлечасопіс «Зала славы: Токіа-2020» (16+).
**19.00** Лёгкая атлетыка. Бостанскі марафон (16+).

## Кінакамедыя

**1.25** «Дзюплекс» (12+).
**3.45** «Крымінальная фішка ад Генры» (16+).
**5.40** «З вачэй — далоў, з чарта — прэч!» (16+)
**7.40** «Хто ведае...» (16+)
**9.55** «Дзікая парачка» 6+).
**11.45** «Дзюплекс» (12+).
**13.20** «Чаго хочуць жанчыны?» (16+)
**15.45** «Халоп» 12+).
**17.45** «Плэйбой пад прыкрыццём» (18+).
**19.30** «Мужчына з гарантыяй» (16+).
**21.05** «Сужэнцы Морган ва ўцёках» (16+).
**23.00** «Іван Царэвіч і Шэры Воўк» (6+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** «Невераготнае пе-расоўванне» (6+).
**9.45** «Азбука здароўя з Генадзем Малахавым» (12+).
**10.40** «Добры дзень з Валерыяй» (12+).
**11.35** «Перыскоп» (16+).
**11.55** «Глядзі сам» (16+).
**12.10, 18.05, 2.40** «Сляпая» (16+).
**13.15, 19.15, 3.35** «Выражбітка» (16+).
**14.20** «Шэрлакі» (16+).
**15.30** «Паглядзім» (12+).
**16.10** «Прывід на дваіх». (12+).
**20.25** «Паляўнічы на прывідаў. Дакументаліст» (16+).
**21.35** «Следства па целе». Серыял (16+).
**0.20** «Развітанне» (16+).
**1.10** «Людзі ў чорным-2» (12+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Доктар Хаус (16+).
**6.50** Сіняя бездань (16+).
**8.30** Сіняя бездань-2 (16+).
**10.05** Скіўцы (16+).
**12.20** Скіўцы-2 (16+).
**14.35** Асобная думка (16+).
**19.00** З любоўю, Розі (16+).
**20.50** Вялікія вочы (16+).
**22.50** Фрыда (16+).
**1.00** Кейт і Леа (12+).
**2.55** Стагоддзе Адалін (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Праваднік (16+).
**7.55** Цені забытых продкаў (16+).
**9.40** Кахае не кахае (16+).
**11.10** Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
**12.50** Усё ці нічога (16+).
**14.25** Мой хлопец — анёл (16+).
**16.10** Каханне з абмежаваннямі (16+).
**18.05** Алёша Паповіч і Тугарын Змей (12+).
**19.35** Пятніца (16+).
**21.10** Мажор (16+).
**23.00, 23.50** Беспрынцыповыя (18+).
**0.50** Абаронцы (12+).
**2.15** Поспех (12+).
**3.45** Каханне і монстры (16+).

## National Geographic

**6.00** Як перамагаць ва ўсім (16+).
**6.30** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**7.20, 13.15, 14.10, 17.35** Аўта-SOS (16+).
**8.10** Ледзяная дарога (16+).
**9.00** Суперкар са сметніка (16+).
**9.50** Рыбы-пачвары (16+).
**10.50, 12.25, 16.45** Дзікі тунец (16+).
**11.40** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**15.00** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**15.50** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.25, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**19.15, 20.05** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 21.50, 3.25** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**22.45** Уварванне на Зямлю (16+).
**23.35** Будзе шторм (16+).
**0.25** Аляска: новае пакаленне (16+).
**1.10** Востраў бунтароў (16+).
**1.55** Ліхтугі за мяжой (16+).
**2.40** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**4.10** Атлас праклятых месцаў (16+).
**4.55** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 10.15, 21.15, 21.40, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10, 23.05, 1.50, 2.45, 3.40, 5.14** Махінатары (12+).
**9.20, 20.20** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**10.40** Прыгожае жыццё (12+).
**12.05** Смяротны ўлоў (16+).
**13.00** Аляска: апошні рубеж (16+).
**13.55, 14.50, 15.45** Чыгунка Аляскі (12+).
**17.35** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**0.00, 6.01** На драйве з Мішэль Радрыгес (12+).
**0.55, 6.48** Геній аўтадызайну (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## аўторак, 12 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 00.55** Зона Х (16+).
**9.10, 22.40 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Нішто не здараецца двойчы» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Драма «Акварэлі» (16+)**
**15.10** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** Гэта іншае.
**22.05** Паспець да паўночы.
**22.35** Беларуская супержанчына.
**0.35** Сфера інтарэсаў.
**1.15** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.55** Тэлебарометр.
**9.05** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.25, 22.35** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.30, 18.20 Баявік «Анёлы» (16+).**
**13.20** «На тыдзень» (16+).
**14.10** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.50** «Паненка-сялянка» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 «Клон». Серыял (16+).**
**17.50** «Каралі палат» (16+).
**20.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.25** «Трэці лішні» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бульбяная кішка з грыбамі.
**8.05, 12.00, 23.25** Навіны культуры.
**8.25, 16.50 «Цені знікаюць апоўдні». Серыял (12+) [СЦ].**
**11.00** «Кіно маёй краіны».
**11.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**12.20** «Беларуская кухня». Цяцюха і гарохавыя аладкі.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Серыял (12+) [СЦ].**
**15.40** «Крылы Перамогі».
**15.55** «Мы вам жадаем». Канцэрт з удзелам ансамбляў «Свята « і «Бяседа».
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**5.55** Тэніс. ВТА.
**8.00** Азбука спорту.
**8.15, 12.15, 16.50, 21.35** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2022.
**10.15, 19.20** Хакей. КХЛ.
**14.15** Гандбол. Кваліфікацыя ЧЕ-2022. Жанчыны.
**15.55** Вось гэта спорт!
**16.15** Аўтаспорт. Экстрым-Е.
**18.50** Спорт-кадр.
**23.35** Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2023 (U-21).

### АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 00.00** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 22.25 Фільм «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15 Фільм «Рускія горкі» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Глядзець усім!» (16+)
**9.30** «Па сутнасці».
**10.40, 0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**11.35** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.30, 20.45, 0.55** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.25, 16.50 «Па законах ваеннага часу». Серыял (12+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**22.00** «P.S.»

### МІР

**5.00** «Еўразія. Культурна» (16+).
**5.05** «Зроблена ў Еўразіі» (16+).
**5.15, 2.15** «Еўразія. Спорт» (16+).
**5.20, 10.10 Серыял «Пілот міжнародных авіяліній» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Бягучы радок.
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.00 Серыял «Даішнікі-2» (16+).**
**2.25, 4.35** «Еўразія. Рэгіёны» (16+).
**2.35** «Нашы замежнікі» (16+).
**2.45** «У гасцях у лічбы» (16+).
**2.55, 4.30** Мір. Спорт (16+).
**3.15, 4.15** Мір. Думка (16+).
**3.30** Спецыяльны рэпартаж (16+).
**3.40** «Даслоўна» (16+).
**3.50** «Стартап па-еўразійску» (16+).
**4.45** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35, 14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны—Беларусь.
**15.40** «Кропкі над і» (16+).
**17.15** «60 хвілін».
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Таямніца Ліліт» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 21.50, 23.20** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Спорт-мікс.
**6.20** «Здароўе» (12+).
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**8.55, 21.55** «НЗ.by».
**9.15** Гісторыі выратавання (12+).
**9.50, 10.25 Серыял «Званар» (16+).**
**11.10 Серыял «Ляснік» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55 Серыял «Чужы раён» (16+).**
**16.30** «За гранню» (16+).
**17.25** «ДНК» (16+).
**18.30, 19.55 Серыял «Крымінальны доктар» (16+).**
**22.15, 23.35 Дэтэктыў «Балабон-4» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 17.10, 21.05, 0.45** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Трансформеры прайм» (6+).
**7.30, 14.15, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.20 Серыял «Зорны шлях» (12+).**
**9.00, 14.50 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**9.45 Серыял «Інданезія» (12+).**
**11.00 Прыгоды «Гары Потэр і Ордэн Фенікса» (12+).**
**13.20 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.10** «Надвор'е».
**14.20** Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
**14.40, 17.15** «Хачу ў Парыж» (12+).
**15.35 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**17.25 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.10 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (12+).**
**19.45 Серыял «МакМафія» (18+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Схватка» (16+).**
**23.10 Серыял «Мар'яна» (16+).**



## субота, 16 кастрычніка

### ВТБ

**6.05** "Раніца з гумарам». Дайджэст (16+).
**8.00** "Зала чакання» (16+).
**9.00** М/ф «Лекс і Плу» (6+).
**9.25** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.50** М/ф «Царэўны» (6+).
**10.20** Анімацыйны фільм «Рыа» (0+).
**12.10** «Гатуем як шэф» (16+).
**12.45** «Велабайкі» (16+).
**13.25, 15.40** Серыял «Івановы-Івановы» (16+).
**17.20** Серыял «Жонка алігарха» (16+).
**20.00** «Форт Баярд» (16+).
**22.05, 2.25** «Уральскія пельмені» (16+).
**23.00** «СелаПаляцела» (16+).
**0.00** Крымінал «Афера ў Маямі» (18+).
**3.50** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**5.00** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «Архангельскія навелы», «Хто ж такія птушачкі», «Апошняя нявеста Змея Гарыныча», «Васіліса Прыгожая». Мультфільмы.
**8.15** «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм [СЦ].
**9.30** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфірававым».
**10.00** «Казкі... Казкі... Казкі старога Арбата». Маст. фільм [СЦ].
**11.45** «Тайнае жыццё казачных чалавечкаў». Серыял [СЦ].
**12.10** «Эрмітаж» [СЦ].
**12.40** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**13.20** Зямля людзей [СЦ].
**13.50, 1.45** «Знаёмцеся: мядзведзі». Дак. фільм [СЦ].
**14.50** Штучны адбор.
**15.30** «Вялікія і маленькія».
**17.20** «Першыя ў свеце». Серыял.
**17.35** «Нябесныя ластаўкі». Мая мілая Бабета! Дзіўна гэта, дзіўна гэта!» Дак. фільм [СЦ].
**18.20** «У пошуках радасці». Дак. фільм [СЦ].
**19.15** «Вялікія міфы. Адысея». Серыял.
**19.40** «Кошка Балу». Маст. фільм.
**21.15** Песні на вершы Жака Прэвера.
**22.00** «Агора».
**23.00** Клуб «Шабалаўка, 37».
**0.10** «Архіўныя таямніцы». Серыял.
**0.35** «Ахоўвай мяне, мой талісман». Маст. фільм [СЦ].
**2.40** «Кот, які ўмеў спяваць», «Усе няцямлівыя». Мультфільмы для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» (18+).
**6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 13.00, 14.35, 15.40, 17.40, 2.05, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Першы тралейбус» (16+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**12.00** «Да і пасля...» (16+)
**13.15** Маст. фільм «Яма» (18+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**17.00, 23.25** «Блефклуб» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Мы з Урала» (12+).
**19.25** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Гараж, ці Ноч у музеі» (16+).
**20.05** «Рок і вакол яго» (16+).
**21.00** «Быў час» (16+).
**22.00** Маст. фільм «Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца» (18+).
**0.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**0.50** Маст. фільм «Мой лёс» (16+).
**2.15** «Па старонках амерыканскага кіно» (12+).

### EuroSport 1

**0.00, 4.00, 7.00, 9.30, 13.30, 14.45, 19.30, 20.45** Снукер. Northern Ireland Open (6+).
**1.00** Веласпорт. «Тур Ламбардыі». Мужчыны (16+).
**2.30** Матагонкі на цягавітасць (16+).
**6.00** Тэлечасопіс «Зала славы: Рыа-2016» (16+).
**8.00** Тэніс. US Open. Мужчыны (6+).
**11.30, 18.35** Лёгкая атлетыка. Чыкагскі марафон (6+).
**12.30** Тэлечасопіс «Зала славы» (16+).
**18.30, 20.40** Навіны (16+).

### Кінакамедыя

**0.40** «Вампірскі засос» (16+).
**2.15** «Спакуснік» (16+).
**4.35** «Спакуснік-2» (16+).
**6.50** «Дзікая парачка» (16+).
**8.40** «Сямейнае рабаванне» (16+).
**10.20** «Дзюплекс» (12+).
**11.55** «Заўсёды гавары «так» (12+).
**13.50** «Вам ліст» (16+).
**16.05** «Выпадковы муж» (16+).



**17.40** «Без пачуццяў» (16+).
**19.30** «Мая супербылая» (16+).
**21.20** «Чаго хочуць жанчыны?» (16+)
**23.45** «Бандыткі» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.55** «Салодкае разватанне Веры» (16+).
**11.00** «Улегцы» (12+).
**11.40** «M&S» (12+).
**12.20, 5.30** «Паглядзім» (12+).
**13.00** «Фантом» (16+).
**15.45** «Дзённік экстрасэнса з Таццянай Ларынай» (16+).
**19.30** «Гэта рэальная гісторыя» (16+).
**20.40** «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)
**21.20** «Пакапайцеся ў маёй памяці» (12+).
**23.15** «Перыскоп» (16+).
**23.40** «Патрашыцелі» (16+).
**1.45** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

### ТБ1000

**5.20** Фрыда (16+).
**7.25** Код да Вінчы (16+).
**10.20** Анёлы і дэманы (16+).
**12.55, 3.05** З любоўю, Розі (16+).
**14.45** Вялікія вочы (16+).
**16.45** Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў (18+).
**19.00** Сталёвыя магноліі (6+).
**21.10** Мачаха (12+).
**23.25** Цуд (12+).
**1.25** Вялікія вочы (16+).

### ТБ1000 Руская кіно

**5.40** Мільён у шлюбным кошыку (12+).
**7.10** Населены востраў (12+).
**9.20** Населены востраў: сутычка (12+).
**11.10** Спадарожнік (16+).
**13.10** Нявеста (16+).
**14.55** Пабочны эфект (16+).
**16.35** Праваднік (16+).
**18.15** Сэлфі (16+).
**20.20** Адзін удых (12+).
**22.10** На вастрыі (12+).
**0.10** Белы снег (6+).
**2.25** Індыга (16+).
**3.55** Маёр Гром: чумны доктар (12+).



### National Geographic

**6.00, 6.35, 7.00** Гульні розуму (16+).
**6.15, 7.25, 7.55** Навуковыя глупствы (16+).
**8.20** Суперзбудаванні (16+).
**9.15, 10.05** Усярэдзіне неверагоднай механікі (16+).
**10.55, 11.50** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**12.45, 13.35, 23.35** Аўта-SOS (16+).
**14.25, 15.15, 16.05** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.55, 17.45** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**18.35, 19.20** Кантрабанда з Мар'янай ван Зелер (16+).
**20.05, 21.00, 21.50** Апошнія крокі Гітлера (16+).
**22.45** Асушыць акіян (16+).
**0.25** Недаследаваныя глыбіні (16+).
**1.15, 2.05** Марс (16+).
**2.50, 3.35** Космас: магчымыя сусветы (16+).
**4.25, 5.15** Гаспадары гор (16+).

### Discovery

**8.00, 7.35** Як гэта зроблена? (16+)
**8.25, 8.50, 9.20, 9.45** Як гэта ўладкавана? (12+)
**10.15, 00.00, 00.55, 1.50, 2.45, 3.40** Махінатары (12+).
**11.10** На драйве з Міншэль Радрыгес (12+).
**12.05** Геній аўтадызайну (12+).
**13.00** Сталёвыя хлопцы (12+).
**13.55, 14.20** Білі скупляе Бруклін (12+).
**14.50** Металаломшчыкі (16+).
**15.45, 18.00** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**20.20** Касмічныя забойцы (16+).
**21.15, 5.14** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**22.10, 23.05, 4.27** Залатая ліхаманка (16+).
**6.01** Несакрэтныя матэрыялы (16+).
**6.48** Уцячы ад пагоні (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

НА СУВЯЗІ

# ГАВАРЫЦЕ, ВАС СЛУХАЮЦЬ!..

## Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ правёў прамую тэлефонную лінію

**Людзі званілі і казалі пераважна пра тое, што іх хвалюе ў паўсядзённым жыцці. І, што цікава, заўважае Андрэй Бугроў, не заўсёды са скаргамі на канкрэтныя пралікі, недапрацоўкі і хібы прадстаўнікоў асобных гарадскіх службаў. Былі і званкі, у якіх суразмоўцы давалі станоўчую ацэнку дзеянням мясцовай улады ў канкрэтных выпадках.**

У гэтым сэнсе паказальным стаў першы званок на прамую тэлефонную лінію ад жыхаркі аднаго з дамоў па вуліцы Шаранговіча. Яна выказала ўдзячнасць сантэхнікам ЖЭСа № 76 і асабіста іх кіраўніку Дзмітрыю Каленіку за ўдарную і аператыўную, без перабольшвання, работу пры падключэнні ацяплення дома. Няпроста было ліквідаваць аварыю, але брыгада рамонтнікаў не пашкадавала сіл і часу, каб выправіць сітуацыю і дапамагчы людзям. Жанчына папрасіла маральна і матэрыяльна адзначыць старанні сантэхнікаў ЖЭСа.

Андрэй Бугроў паабяцаў мінчанцы знайсці магчымасць для заахвочвання добрасумленных работнікаў гарадскіх ЖЭСаў, бо дзякуючы таксама і іх намаганням сёлета ў ходзе бягучай кампаніі па падключэнні цяпла ў сталіцы колькасць крытычных зваротаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года зменшылася



на 26 працэнтаў. А гэта ў маштабах двухмільённага горада — сур'ёзная лічба, якая сведчыць аб паступовых якасных зменах у рабоце раённых камунальных службаў, гаворыць Андрэй Бугроў.

Мінчанка, якая жыве па вуліцы Калініна, у сваім, дарэчы, паўторным звароце на прамую тэлефонную лінію таксама выказала словы ўдзячнасці за вырашэнне ўзнятага ёй пытання. Яна прасіла прывесці ў парадак дваровую тэрыторыю вакол яе дома і суседніх пабудоў. Цяпер агучыла яшчэ адну просьбу: зрабіць уздоўж дома тратуар і ліўневы сцёк.

Суразмоўцы старшыні гарадскога Савета звярталі яго ўвагі на іншыя, няхай і дробныя, але ўсё ж непрыемныя моманты ў іх паўсядзённым жыцці. Жыхара аднаго з дамоў па вуліцы Брацкай непакоіць і моцна раздражняе амаль няспынны рух цяжкіх грузавікоў пад вокнамі яго кватэры да новабудоўляў, якія знаходзяцца побач. А гэта і шум, і пыл з пяском. Як падлічыў мужчына, штодзень праз яго квартал праходзіць ад 50 да 100 вялікіх самазвалаў. Адсюль і просьба: калі ласка, дапамажыце змяніць маршрут руху грузавых аўтамабіляў! Пытанне ўзята на кантроль гарсаветам, яно патрабуе дадатковага вывучэння.

З іншым транспартным пытаннем — адносна ўдасканалення перавозкі пасажыраў — звярнулася жыхарка вуліцы Маршала Лосіка. Яе жыццё, як і жыццё іншых насельнікаў гэтай і суседніх вуліц, ускладняе недастатковая колькасць аўтобусаў, бо ў іх «ходзіць толькі адзін аўтобус № 90». Гэтага недастаткова, таму аўтобус звычайна моцна перапоўнены. Мінчанка прапанавала павялічыць колькасць грамадскага транспарту на гэтым напрамку, а таксама і колькасць маршрутаў. Бо атрымліваецца, што даехаць, скажам, да 10-й паліклінікі можна толькі з перасадкамі.

Пытанне будзе прапрацавана з адпаведнай гарадской службай, якая адказвае за пасажырскі транспарт, паабяцаў старшыня гарадскога Савета.

— А ўвогуле, настрой пасля гэтай прамой тэлефоннай лініі пазітыўны. Так, людзі агучвалі розныя праблемы, ставілі пытанні, патрабавалі часам навесці парадак, аднак размова вялася ў канструктыўным рэчышчы, — адзначыў Андрэй Бугроў.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

ДАПАМОГА

# «Людзі ацанілі наш клопат»

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў парламента Вольга ПЕТРАШОВА перадала ад імя Беларускага саюза жанчын гуманітарную дапамогу тым, хто сёння знаходзіцца на граніцы Беларусі з Літвой і Польшчай.**



Прадстаўніцы грамадскай арганізацыі паклапаціліся сабраць для мігрантаў цёплыя рэчы, прадукты харчавання, прысмакі. Усё гэта было перададзена ім праз начальніка пагранзаставы Брузгі.

— Для нас вельмі важныя пытанні здароўя і дабрабыту дзяцей, маці і іх сем'яў, — адзначыла Вольга Петрашова. — Сёння на граніцы з Літвой і Польшчай знаходзяцца і дзеці, і жанчыны, і людзі сталага веку. Беларускі саюз жанчын не мог застацца ўбаку і абыякава назіраць за тым, што адбываецца. Мы ўжо не ўпершыню перадаём туды гуманітарную дапамогу. Тое, што там адбываецца, бесчалавечна. Мы звяртаемся да еўрапейскіх палітыкаў, да праваабаронцаў, да ўсіх тых, у чыёй кампетэнцыі знаходзяцца пытанні міграцыйнага працэсу. Людзі імкнуцца ў Еўрасаюз не па добрай волі. З-за ўмяшання ва ўнутраныя справы іх краін яны вымушаны шукаць лепшага жыцця на тэрыторыі Еўрасаюза, які трансліраваў дэмакратычныя каштоўнасці. А з імі абышліся вельмі жорстка і бесчалавечна.

Наша дапамога была вельмі дарэчы. Нам ужо паведамілі, што яна дайшла да адрасата. Людзі дзякуюць за ўвагу і нашай арганізацыі, і краіне. Яны адчуваюць наш клопат пра іх і вельмі ўдзячныя за ўвагу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Вольгі ПЕТРАШОВАЙ.**

# ДОМ ДЛЯ СВЯТАЎ, ТВОРЧАСЦІ І АДПАЧЫНКУ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Удзельнікі выязнога пасяджэння для знаёмства з установамі культуры раёна абралі Цярэшкавіцкі, Грабаўскі, Маркавіцкі і Чарацянскі сельскія Саветы. Увага — на формы работы з маладымі людзьмі і падлеткамі, паслугі для карыснага баўлення вольнага часу, праекты патрыятычнага выхавання і папулярызацыі здаровага ладу жыцця.

Сельскі Дом культуры — месца калектыўнага свята, творчасці і адпачынку. Гэта тое, да чаго імкнуцца спецыялісты ўстаноў культуры ў сваёй рабоце на месцах, адзначыла **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА:**

— Дзейнасць устаноў культуры накіравана на максімальны ахоп моладзі змястоўным вольным часам. Як бачым, цяпер у кагосьці гэта атрымліваецца, а камусьці яшчэ трэба пастарацца, каб запусціць новыя праекты, якія прыцягнуць больш значную аўдыторыю. Задача культработнікаў — прапанаваць моладзі сучасны фармат для творчага самавыяўлення, — упэўнена кіраўнік дэпутацкага корпуса раёна.

Установы культуры на вёсцы могуць адыгрываць лідзіруючую ролю ў развіцці пазнавальнай і мастацкай дзейнасці школьнікаў і моладзі, прывіваць любоў да родных мясцін, да сельскай працы, традыцый у вясковым побыце і культуры. Сваімі заўвагамі і прапановамі, як зрабіць рэалізацыю маладзёжнай палітыкі ў сферы культуры больш эфектыўнай, дэпутаты падзяліліся падчас круглага стала.

— Рэсурсы для арганізацыі новых форм вольнага часу на сяле ёсць. Практыка паказвае, што малады людзі актыўна падтрымліваюць цікавыя ініцыятывы. Прыклад таму — папулярныя і любімыя конкурсы «Уладар сяла» і «Найлепшая маладая сям'я Гомельшчыны», — падзяліўся сваім бачаннем **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар ЗАВАЛЕЙ.** — Шмат робіцца, і ў той жа час ёсць яшчэ значны патэнцыял! Сельскія дамы культуры павінны быць цэнтрам прыцягнення для моладзі, а для гэтага неабходна крочыць у нагу з часам, — адзначыў парламентарый. У яго выбарчай акрузе — у тым ліку значная частка населеных пунктаў Гомельскага раёна. Пра тое, як жывуць і працуюць, але і цэняць добры актыўны адпачынак жыхары раёна, дэтутат ведае па сваёй рабоце.



Фота Цэнтра культуры Гомельскага раёна.

**Удзельнікі фальклорнага свята «Арэхавы Спас» Старабеліцкага клуба-бібліятэкі Гомельскага раёна.**

— Несумненна, моладзь імкнецца заявіць пра сябе, у тым ліку праз творчасць. І ёй павінна быць дадзена такая магчымасць, а больш расказаць пра тое, якія паслугі аказваюць дамы культуры, дапамогуць сацсеткі і розныя месенджары, — лічыць парламентарый.

Удзельнікі круглага стала адзначылі, што варыянтаў для культурнага адпачынку і духоўнага развіцця ў маладых вяскоўцаў нямала і яны досыць разнапланавыя, аднак на практыцы моладзь далёка не ўсюды актыўна наведвае сельскія дамы культуры.

Напрыклад, у Цярэшкавіцкім Доме культуры прадстаўлены розныя аб'яднанні па інтарэсах — у тым ліку для аматараў цыркавога мастацтва, для ахвотных вывучаць замежныя мовы. Але займаюцца ў іх у асноўным дзеці школьнага ўзросту. Прадстаўнікоў працоўнай моладзі ў гэтым Доме культуры ўбачыш нячаста. Іншы прыклад — Дом культуры ў Грабаўцы, які ў цяперашні час не мае асобнага будынка, але ўстанова папулярная як сярод школьнікаў, так і сярод юнакоў і дзяўчат, якія працуюць на прадпрыемствах і ў арганізацыях. Грабаўскі Дом культуры ў супрацоўніцтве з сельскай бібліятэкай, дзіцячым садком — сярэдняй школай арганізоўвае квэсты, фестывалі, стылізаваныя святы. Кожнае мерапрыемства праходзіць з размахам і мае станоўчыя водгукі, адзначаюць у раёне.

Калі аналізаваць у цэлым работу з моладдзю, то нельга не заўважыць, як актыўна маладое пакаленне вяскоўцаў адгукаецца і прапаноўвае дапамогу ў падтрымцы ветэранаў і састарэлых, далучаецца да суботнікаў, добраўпарадкавання тэрыторый воінскіх пахаванняў і брацкіх магіл, бярэ актыўны ўдзел у акцыях да святочных дат і дзяржаўных свят.

— Стала традыцыйным правядзенне штогадовых сустрэч маладых спецыялістаў з кіраўніцтвам раённага выканаўчага камітэта, прадстаўнікамі розных службаў, банкаўскімі работнікамі, дзе юнакі і дзяўчаты могуць напрамую задаць хвалюючыя пытанні, ацаніць раён, у які яны прыбылі, даведацца пра яго гісторыю, геаграфію, далучыцца да экскурсій, якія арганізоўваюцца ў рамках сустрэч, паўдзельнічаць у канцэртных праграмах, — звярнула ўвагу старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя Ладуцька. Кіраўнік дэпутацкага корпуса таксама зазначыла, што ў раёне надаюць вялікае значэнне рабоце з адоранай і таленавітай моладдзю.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## Адчуць сябе сенатарамі

**Такую магчымасць атрымалі вучні старшых класаў мінскай гімназіі № 11 імя Івана Чарняхоўскага, слыннага военачальніка Вялікай Айчыннай вайны, падчас наведвання Савета Рэспублікі.**

У залу пасяджэнняў верхняй палаты парламента хлопцы і дзяўчаты трапілі ў пэўным сэнсе падрыхтаванымі: з вучнямі правялі азнаямленчую экскурсію па будынку, прадэманстравалі кароткаметражны фільм аб дзейнасці Савета Рэспублікі, пазнаёмілі з практыкай абмеркавання пытанняў парадку дня, прыняцця рашэнняў яго членамі, сістэмай галасавання.

А потым гаспадары прапанавалі маладым людзям максімальна ўключыць фантазію. Маўляў, яны ў дадзены момант з'яўляюцца дзеючымі сенатарамі, якім сёння трэба разгледзець і абавязкова прыняць рашэнне па надзвычай важным законапраекце: уводзіць у краіне дадатковыя канікулы для школьнікаў ці не? Дыскусія разгарнулася не на жарт. У ходзе дэбатаў падлеткі энергічна выказвалі розныя, часам супрацьлеглыя, пункты погляду.



А пасля гэтай «гульні ў парламентарыяў» у размову ўключыўся **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ.** Яго сустрэча са школьнікамі прайшла пераважна ў рэжыме дыялогу. Тэмы былі розныя: аб асаблівасцях заканадаўчай дзейнасці ў верхняй палаце парламента, аб напрамках знешняй палітыкі нашай краіны, аб магчымасцях удзелу моладзі ў парламенцкай дзейнасці, вакцынацыі ад каранавіруснай інфекцыі, верагодных зменах у здачы экзаменаў і г. д.

Асобнай тэмай стала размова аб маючых адбыцца зменах у Канстытуцыі Беларусі. Сяргей Сівец даў вычарпальны адказ на пытанне пра аб'ектыўныя прычыны перамен у Асноўным Законе дзяржавы, ход работы Канстытуцыйнай камісіі.

Таксама ў сустрэчы ўдзельнічаў старшыня камісіі Маладзёжнага Савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь па прадпрымальніцтве, эканоміцы і інавацыйным развіцці Максім Крупейчанка. Ён расказаў пра асаблівасці сваіх калег.

Госці падзякавалі сенатарам і супрацоўнікам сакратарыята Савета Рэспублікі за такую цікавую сустрэчу, за магчымасць убачыць на свае вочы месца, дзе прымаюцца законы, паглядзець, як наладжана работа верхняй палаты парламента, яе апарату.

**Леанід ТУГАРЫН.**

ДАПАМОГА

## Чым цікавяцца беларусы

### ў юрыста і адваката

**Афармленне спадчыны, адчужэнне нерухомай маёмасці, сведчанне дагавораў дарэння, а таксама льготы для шматдзетных сям'яў, спагнанне аліментаў, выдзяленне арэнднага і сацыяльнага жылля — гэта асноўныя пытанні, якія задавалі ўдзельнікі акцыі па бясплатным юрыдычным кансультаванні, натарыусам і адвакатам краіны.**

Да натарыусаў 1 кастрычніка звярнулася амаль дзве тысячы чалавек. Пры гэтым найбольшую зацікаўленасць праявілі брастаўчане — для іх правялі 431 кансультацыю. 2 кастрычніка натарыусы Беларусі ўзялі ўдзел у Міжнароднай акцыі па бясплатным кансультаванні, якая праводзілася пад эгідай Міжнароднага саюза натарыусаў, і ў межах мерапрыемства прынялі яшчэ 684 грамадзяніны, адзначыла **прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі Вольга ШЫБКО:**

— Нягледзячы на эпідэміялагічную сітуацыю і адпаведныя карэктывы нашага жыцця, яно не спынілася. Юрысты, як і раней, аказваюць кваліфікаваную юрыдычную дапамогу грамадзянам і арганізацыям і ладзяць бясплатныя акцыі па ўсёй краіне. Сустрэчы з людзьмі адбываюцца як на асабістых прыёмах спецыялістаў, так і праз «прамыя тэлефонныя лініі», а таксама месенджары ў сацыяльных сетках.

Грамадзян, якія звярнуліся да натарыусаў па кансультацыю, турбуе таксама сведчанне завяшчанняў, складанне і сведчанне шлюбных дагавораў, здзяйсненне выканаўчых надпісаў.

Адвакаты, якія таксама ўдзельнічалі ў акцыі па бясплатным кансультаванні, у Дзень пажылых людзей далі парады 305 чалавекам. Усяго ж сёлета юрыдычную дапамогу ў выглядзе кансультацый ад адвакатаў атрымалі 1385 грамадзян. Апроч пытанняў па льготах для шматдзетных сям'яў і тых сям'яў, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід, беларусы цікавяцца адказнасцю наймальніка за затрымку разліку і магчымасцю датэрміновага скасавання працоўнага кантракта.

**Ірына СІДАРОК.**

# З сельскім майстрам і «Пескаўскай талакой»

## Як у сельсавеце Бярозаўскага раёна рэалізуюцца сацыяльна значныя праекты

**У цэнтральнай частцы аграгарадка Пескі неўзабаве вымалюецца прыгожая зона адпачынку. І пачаткам яе стала дзіцячая пляцоўка, адкрыццё якой запланавана на другую палову гэтага месяца. Зараз ідуць работы па ўстаноўцы гульнявога комплексу. «Клопаты па добраўпарадкаванні былой пусткі, на якой размесціцца пляцоўка, падыходзяць да завяршэння», — кажа старшыня Пескаўскага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ШЫМЧУК.**



Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, гэта іх сумесная работа з мясцовым фондам «Цэнтр падтрымкі сельскага развіцця і прадпрымальніцтва Столінскага раёна» і фондам «Партнёрства ў дзеянні» Белаазёрска. Разам рэалізоўваецца ініцыятыва па выкарыстанні новых форм і метадаў для аказання сацыяльных паслуг сельскім жыхарам Бярозаўскага раёна. Дзіцячая пляцоўка — гэта другая частка вялікай работы па рэалізацыі згаданай ініцыятывы. А першай справай у гэтым кірунку стала стварэнне мабільнага будаўнічага атрада «Майстравы» і вясковага кааператыва «Сельскі майстар».

Прадстаўнікі фондаў сустрэліся з зацікаўленымі вяскоўцамі, найперш тымі з іх, хто пакуль не мае пастаяннай працы, і прапанавалі стаць «Майстравымі». За сродкі фонду куплены матакосы, якімі двое першых працаўнікоў атрада дагледаюць навакольную тэрыторыю. Мужчыны косяць траву ў грамадскіх месцах, а таксама аказваюць паслугі жыхарам вёсак. І, што цікава, першыя месяцы паслугі аказваюцца бясплатна. Зразумела, што касцы найперш дапамагаюць састарэлым, адзінокім жыхарам вёсак, тым, хто найбольш мае патрэбу ў дапамозе. Яны яшчэ дровы пілуюць, колюць. Ну і, вядома, такая работа адыгрывае пэўную рэкламную ролю. Людзі цікавяцца, калі можна будзе заказаць падобныя альбо іншыя паслугі ў прадстаўніка такой працоўнай брыгады. Старшыня сельвыканкама адзначыў, што ёсць папярэднія заяўкі на рамонт даху, іншыя работы па добраўпарадкаванні жылых дамоў і навакольнай тэрыторыі.

Як паведаміла **Людміла БЯЛЕЦКАЯ, спецыяліст па рабоце з грамадскасцю ініцыятывы «Выкарыстанне новых формаў і метадаў для аказання сацыяльных паслуг сельскім жыхарам Бярозаўскага раёна»,** зараз вядзецца арганізацыйная работа па афармленні кааператыва «Сельскі майстар». Кааператыў будзе зарэгістраваны ва ўстаноўленым законам парадку і пачне працаваць на ўмовах гаспадарчага разліку. А для яго паспяховага старту і патрэбна рэкламная кампанія некаторых відаў работ, якая цяпер вядзецца. Вясковыя жыхары ўпэўняцца, што паслугі аказваюць якасна, своечасова, і пачнуць заказваць іх у кааператыве. Фонд жа бярэ на сябе абавязацельства набыць патрэбнае абсталяванне, каб можна было праводзіць пэўныя рамонтныя работы, апрацоўваць агароды і прысядзібныя ўчасткі, касіць траву.

У кастрычніку ў вёсцы запланаваны два семінары, на якія будуць запрошаны патэнцыяльныя працаўнікі кааператыва. Такіх з дзевяці населеных пунктаў сельсавета набіраецца нямала. Тыя з вяскоўцаў, хто не баіцца працы і мае вялікае жаданне знайсці пастаянную работу, атрымае яе. Ну а сельскія жыхары не будуць ламаць галаву ў пошуках сілы, якую можна наняць для той ці іншай работы.

Людміла Бялецкая падкрэсліла, што гаворка ідзе пра адну з ініцыятыў праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізоўваецца Праграмай развіцця ПРААН у партнёрстве з Міністэрствам эканомікі Беларусі. Знакавай падзеяй ініцыятывы стане адкрыццё ў Песках дзіцячай пляцоўкі, пра якую ішла гаворка ў самым пачатку. Мерапрыемства гэта яго арганізатары назвалі «Пескаўскай талакой», бо на падрыхтоўку да работы пляцоўкі запрошаны сем'і з дзецьмі. Вяскоўцы выказалі жаданне папрацаваць разам на добраўпарадкаванні, навядзенні прыгажосці на пляцоўцы, каб потым агульнымі намаганямі падтрымліваць яе, сачыць за захаванасцю і правільнай эксплуатацыяй абсталявання.

> Тыя з вяскоўцаў, хто не баіцца працы і мае вялікае жаданне знайсці пастаянную работу, атрымае яе. Ну а сельскія жыхары не будуць ламаць галаву ў пошуках сілы, якую можна наняць для той ці іншай работы.

А калі рыхтавалі поле для будучай пляцоўкі, нарадзілася яшчэ адна ініцыятыва наконт таго, як пашырыць і палепшыць зону адпачынку. Побач з пляцоўкай ёсць вадаём, які з дапамогай мясцовай улады ачысцілі, прывялі ў парадак. Далей узнікла ідэя з часам устанавіць прыгожую альтанку, ды такую, што можна будзе ў летні час праводзіць урачыстую рэгістрацыю шлюбу. І гэтая ідэя можа стаць рэальнасцю, калі жыхары Пескаў возьмуцца за яе рэалізацыю талакой.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 7 кастрычніка 2021 года.

# ВІЛЕЙСКІ «КІТ»

## Вандроўка па самым буйным вадасховішчы Беларусі

**Паглядзіце на карту паўночна-цэнтральнай Беларусі — і заўважыце, што менавіта тут размешчана больш за ўсё «сініх ямачак». Гэта нам пакінулі ў спадчыну старажытнасці, калі тут слізгалі Скандынаўскія ледавікі. Снуды, Дрывяты, Нарач, Мястра, Баторына, ніжэй — нешта доўгае, падобнае на кіта, які вось-вось перавернецца... Гэта ўжо дакладна не ледавік, а рукатворны аб'ект, да якога прыклалі шмат фізічнай сілы людзі з розных куткоў Савецкага Саюза. У Вілейскім раёне знаходзіцца самае буйное вадасховішча Беларусі.**



На адкрыцці Вілейскага вадасховішча. 1975 год.

### «З'ездзім» у гісторыю

З Мінска ў Вілейку можна трапіць рознымі шляхамі. Найбольш проста — выехаць на Даўгінаўскі тракт, арыентуючыся на Ілью, затым збочыць на Вязынь. А можна падоўжыць дарогу, рухаючыся ў напрамку Маладзечна. У любым выпадку, дарога будзе весці вас між крутымі жоўтымі пагоркамі, якія змяняюцца густымі рыжымі радкамі сасонніка. Вёскі тут то мільгаюць на ўзвышшы, то хаваюцца ў цені лагчын — адны толькі дахі з комінамі тырчаць.



Будучае дно Вілейскага «мора».

Аднак, які б шлях на Вілейку ні абралі, вы будзеце пераязджаць мост, пад якім працякае акуратны прыгожы канал. Раю вам спыніцца і паназіраць: вада тут цячэ ўгару, у бок Мінска. Адказваючы сабе на пытанне, як гэта вада цячэ ўгару, здагадваемся: недзе працуе гідраэлектрастанцыя. І не адна.

Да пачатку 1980-х гадоў Мінск меў патрэбу ў запасе вады. Дзе ўзяць? Кіраўніцтва разглядала некалькі варыянтаў: рэкі Пціч, Бярэзіна, вярхоўе Нёмана, аднак спыніліся на вяртлявай Віліі — гэты варыянт быў таннейшы, ды і якасць вады адпавядала нормам. Перакрывалі Вілію 8 верасня 1973 года. Але сама будоўля Вілейска-Мінскай воднай сістэмы (далей — ВМВС) пачалася з 1968 года і завяршылася ў 1976-м — то-бок працягвалася амаль 10 год!

У кнізе «Памяць. Вілейскі раён» ёсць артыкул Вольгі Коласавай — выдатнага спецыяліста па «дзяржаве на Вяллі». Адтуль мы даведваемся, што ВМВС — «першы у рэспубліцы буйны гідратэхнічны комплекс па перакідванні сцёку басейна Балтыйскага мора ў цэнтральную і далей у паўднёвую часткі Рэспублікі Беларусь, г. зн. да басейна Чорнага мора. <...> Сістэма ўяўляе з сябе комплекс складаных гідратэхнічных збудаванняў, якія ўключаюць Вілейскае вадасховішча, канал для перакідвання вады, шэраг штучных вадаёмаў на Свіслачы і адрэгуляванае рэчышча ракі да вусця яе левага прытока — ракі Волмы ўключна <...> Даўжыня галоўнага вадасцёку сістэмы складае больш за 200 км».

Каб размясціць вадасховішча, прыйшлося высякаць амаль 3300 гектараў лесу, пад знос пайшлі восем вёсак і некалькі хутароў. Найбольш цяжка было пакідаць сваю зямлю тутэйшым сялянам. Альшанка, Касуцкае, Малмыгі, Пахомава, Рыбчына, Сенішча, Слабада і Ольшына — вёскі, якіх няма на сучасным карце.

Побач з вёскай Снежкава, у напрамку Вілейкі, з правага боку вы ўбачыце макет празрыста-сіняй хаты, да якой вядзе невялічкі мост умоўнай ракі. Гэта мемарыяльны комплекс «Памяці былых вёсак». Ён складаецца з 13 валуноў, і ў кожнага ёсць сваё імя (табліца са спіскам населеных пунктаў, якія з нейкіх прычын зніклі з карты раёна). Адзін з камянёў у выглядзе паваленага звона — сімвалізуе цяжкі лёс пяці населеных пунктаў, спаленых падчас Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць тут валун, устаноўлены з прычыны затаплення васьмі вёсак.

### «Можа, кароўка на радзіму пайшла?»

50 гадоў таму Раісе Соніч прыйшлося з'ехаць з роднай вёскі Рыбчына ў Вілейку. Як паведаміла Раіса Пятроўна, тады мясцовых жыхароў патрохі падрыхтоўвалі: ішлі размовы па вёсках не адзін год, аднак што канкрэтна тут збіраліся будаваць, людзі не ведалі. Калі моладзь была і не супраць такіх перамен, то для старых людзей гэта ўяўлялася сапраўды трагедыяй: з'язджаць з абжытага месца, кідаць агарод, хлявы, нарэшце, хату, у якой пражылі жыццё і ўжо прымецілі месца для вечнага спакою... А тут — з'язджай! Дзяржава падтрымлівала людзей: давала кватэры ў Вязыні (недалёка ад Ілы) тым, у каго хата была занадта старая. Дамы, якія лічыліся адносна новымі і прыдатнымі для пражывання, пераносіліся рабочымі ў Вязынь і іншыя суседнія вёскі. Так, напрыклад, у Вязыні ёсць вуліца Рыбчынская. У Чыжэвічах, што на процілеглым беразе Віліі, ёсць вуліца Малмыжская. Многія ўвогуле з'язджалі да родзічаў — у Вілейку, Маладзечна, а то і ў Расію.

— Раскажу вам такую гісторыю. Як мы перабраліся ў Вілейку, то ўзялі з сабой нашу цёцю і яе карову — даглядаць. Вось ужо і прыжыліся, уладкаваліся. Раніцай карову адправілі ў поле, а вечарам глядзім, а скаціны няма! Абшукаліся, дык суседзі нам кажуць: «Можа, яна на радзіму пайшла?» Паехалі на радзіму, і праўда: 20 кіламетраў ішла, не заблудзіла і вярнулася ня роднае месца. Вось як бывае, нават жывёліна сумавала па нашым Рыбчыне.

